ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. При аматарэвым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX-24 г. бярэцца 10 проц. надбавку.

# ЗЬВЯЗДА

Пралетары усіх краін, злучайцеся!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Н

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар . . . . 10-74
Сакратар . . . . 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Адзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ 1 чэрвеня 1930 г.
№ 126 (3724)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

## XIII ЗЬЕЗД КП(б)Б

# ЗЬЕЗД ЦАЛКАМ і ПОЎНАСЬЦЮ УХВАЛІЎ ПАЛІТЫЧНУЮ ЛІНІЮ ЛЕНІНСКАГА ЦК УсеКП(б)

## Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) няўхільна вядзе партыю і рабочую клясу па Ленінскім шляху да канчатковай перамогі, да сацыялізму

## Пастанова зьезду па дакладу ЦК УсеКП(б)

**XIII зьезд Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі, заслухаўшы даклад т. Мануільскага, цалкам ухваляе палітычную лінію і арганізацыйную дзейнасьць Цэнтральнага Камітэту ўсесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў).**

## Дзеньнік зьезду

**Ранішняе пасяджэньне** 31 мая адрылася спрэчкамі па дакладу тав. Мануільскага аб рабоце ЦК УсеКП(б).

Усе таварышы, выступаўшыя ў прэчках, адзінадушна адзначылі, што ЦК УсеКП(б) цьвёрда стаяў на ленінскіх пазыцыях, пабаявому праводзіў ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых XV зьездам партыі.

**Тав. Кавальчук** сказаў, што ЦК УсеКП(б), ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі, сваячасова мабілізаваў увагу партыі па барацьбу з правым ухілам, на барацьбу з контрэвалюцыйным трацкізмам.

Посьпехі нашага сацыялістычнага будаўніцтва разьбілі ўшчэнт апартуністычную тэорыю правага ўхілу, а таксама назаўсёды пахавалі контр-рэвалюцыйную тэорыю трацкізму, якая прадракала пагібель дыктатуры пралетарыяту ў нашым краі.

**Тав. Ягораў** сказаў.—Больш двух год аддзяляе нас ад XV зьезду УсеКП(б). Ніколі яшчэ мы ні да аднаго зьезду партыі не падыходзілі з такімі вялізарнейшымі вынікамі нашых дасягненьняў, як да XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б.

Усе гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы правільнаму кіраўніцтву ЦК УсеКП(б), дзякуючы сваячасовай мабілізацыі рабочых мас па выкананьне генэральнай лініі партыі.

— ЦК УсеКП(б), гаварыў т. Ягораў, многа і сваячасова аддаваў увагі Чырвонай арміі, яе баявой палітычнай падрыхтоўцы. Трэба ў далейшым зьвярнуць больш увагі на жыльлёвыя ўмовы камандна-палітычнага складу Чырвонай арміі.

Далей выступалі т. т. **Славінскі, Шаршнёў, Хайтовіч, Скробут, Нікіфараў, Пейсюк, Стракоўскі, Гантман, Аранштам, Клябанаў, Вальфсон, Сьцяпанаў, Балцін, Хаськін, Гніляжевіч, Міроненка, Арашчук, Рашотнікаў і Соскін.**

**На вячэрнім пасяджэньні** 31 мая працягваліся спрэчкі па дакладу ЦК УсеКП(б).

У спрэчках выступілі т. т. **Шпэктараў, Танхілевіч, Рачыцкі, Гольдбэрг, Галадзед,** пасьля чаго зьезд заслухаў заключнае слова тав. **Мануільскага.**

Тут-жа, на вячэрнім пасяджэньні, было заслухана прывітаньне ад №-скага артпалка.

Зьезд аднагалосна прыняў рэзалюцыю, у якой цалкам і поўнасьцю ўхваляе палітычную лінію і арганізацыйную дзейнасьць Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай Партыі (бальшавікоў).

Зьезд паслаў прывітальную тэлеграму ЦК УсеКП(б).

## XIII партзьезд (бальшавікоў) Беларусі—ЦК УсеКП(б)

**Правадыру рабочае клясы, арганізатару пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, непахіснаму барацьбіту за ленінізм—ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту Ўсесаюзнай Камуністычнай Партыі — XIII зьезд КП(б)Б ад імя бальшавікоў Савецкай Беларусі шле сваё баявое камуністычнае прывітаньне.**

**Працоўныя Савецкай Беларусі разам з працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу пад правільным кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту Ўсесаюзнай Камуністычнай Партыі дасягнулі вялізарных посьпехаў на новым рэканструкцыйным этапе сацыялістычнага будаўніцтва.**

**Вядучы барацьбу на два франты, перамагаючы ўсякага роду ўхілы ад асноўнай лініі партыі, пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), партыя разьбіла ўшчэнт рэшткі контр-рэвалюцыйнага трацкізму, нанесла руйнуючы ўдар праваму ўхілу, які застаецца галоўнай небясьпекай на даным этапе і дала адпор «левым» загібам, якія стваралі пагрозу паслабленьня змычкі рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства.**

**Час, які прайшоў ад XV зьезду партыі, зьявіўся пэрыядам сусьветнага гістарычнага, па свайму значэньні, пералому на франтох сацыялістычнага будаўніцтва. За гэты час адбыліся найглыбейшыя рэвалюцыйныя зрухі ў эканоміцы нашага краю і ў суадносінах клясавых сіл, якія забясьпечваюць і ў далейшым рашаючыя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі.**

**Цьвёрда змагаючыся з усякімі апартуністымі за чыстату рэвалюцыйнай марксыцка-ленінскай тэорыі, пільна ахоўваючы жалезнае адзінства партыі і Камінтэрну на падставе ленінізму, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) няўхільна вядзе партыю і рабочую клясу па ленінскім шляху да канчатковай перамогі пралетарскай рэвалюцыі ва ўсім сьвеце.**

**Спробы скарыстаць для дыскрэдытацыі генэральнай лініі Камуністычнай Партыі і ленінскага Цэнтральнага Камітэту ЎсеКП(б) дапушчаныя асобнымі арганізацыямі перагібы і скажэньні лініі партыі ў галгасным будаўніцтве, якія мелі месца, ня гледзячы на сваячасовыя, ясныя і выразныя дырэктывы ЦК УсеКП(б),—спаткалі з боку ўсіх арганізацый КП(б)Б рашучы, бязьлітасны адпор.**

**Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі разам са ўсёй КП(б) і ў далейшым дасьць самы рашучы адпор усякім апартуністычным вылазкам і хістаньням у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і ліквідацыі на глебе суцэльнай калектывізацыі кулацтва, як клясы, а таксама КП(б)Б дасьць самы рашучы адпор апартуністычным хістаньням у адносінах да ўзятых тэмпаў індустрыялізацыі.**

**За час, які прайшоў ад XII зьезду КП(б)Б, наша партыя нанесла рашучы ўдар аднэй з рознавіднасьцяй правага ўхілу ва ўмовах Беларусі—нацыянал-апартунізму. Наша партыя нанесла руйнуючыя ўдары беларускаму нацыянал-дэмакратызму і шавінізмам усіх колераў.**

**Да надыходзячага XVI зьезду ЎсеКП(б) камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі прыходзіць адзінай, згуртаванай навакол ленінскага Цэнтральнага Камітэту ЎсеКП(б), навакол генэральнай лініі камуністычнай партыі.**

**НЯХАЙ ЖЫВЕ СТАЛЕВАЕ АДЗІНСТВА МАГУТНЫХ РАДОЎ УСЕСАЮЗНАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ!**

**НЯХАЙ ЖЫВЕ НЕПРЫМІРЫМАЯ БАРАЦЬБА ЗА ЧЫСТАТУ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ!**

**НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УсеКП(б)!**

**НЯХАЙ ЖЫВЕ XVI УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД ПАРТЫІ!**

**НЯХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНАЯ ПРАЛЕТАРСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ!**

**КП(б)Б БЫЛА, ЁСЬЦЬ І БУДЗЕ ЦЬВЁРДЫМ ЛЕНІНСКІМ БАЯВЫМ АТРАДАМ УсеКП(б).**

## Трынаццаты бальшавіцкі

**Трынаццаты.** Гэта значыць, што зваду дванаццаць дат, дванаццаць баявых пераноўненых багатым рэвалюцыйна-творчым зьместам гадоў напорыстай бальшавіцкай работы.

Кожны з дванаццаці зьездаў ставіў новую веху на трудным, але пераможным шляху да сацыялізму, на тым шляху, на якім ідуць ня тысячы, ня дзесяткі тысяч, а мільёны. І пасьля кожнага зьезду бальшавікоў яснейшай станавілася дарога, выразьней вырысоўвалася канчатковая мэта, дружней раздаваўся крок магутнага маршу мільёнаў.

Уперад і вышэй! Уперад і вышэй!—вось нязьменны дэвіз маршавых калён, пракладаючых дарогу да камунізму. А ў авангардзе калён—заўсёды, нязьменна ленінская УсеКП(б), ападаная і загартаная ў крывавых і бяскроўных баях, моцна зьвязаная тысячамі прывадоў з рабоча-сялянскімі масамі. І заўсёды нязьменна і цьвёрда баямі кіруе цэнтральны ленінскі штаб—ЦК УсеКП(б)—уводзячы ў бой усё новыя рабоча-сялянскія рэзэрвы, натхняючы масы ўсё больш магутным творчым энтузіязмам.

Масы нязьменна ішлі ў бой за ленінскай партыяй і—нязьменна перамагалі, ня гледзячы на шаленае супраціўленьне ворагаў, наперакор прароцтвам апартуністых і папікераў у самой партыі.

У гэтых перамогах бальшавікоў віднае месца займала і займае непрымірымая, прасякнутая творчым рэвалюцыйным зьместам, самакрытыка мас. Яна—тая вострая зброя, якою наносяцца руйнуючыя ўдары клясавым ворагам, шкодінкам, апартунізму і чванству.

Яна будзе дзейнічаць ў працах трынаццатага зьезду.

***

Зьезды ў бальшавікоў гэта абрэсьленае падсумаваньне работы, гэта пейкі новы разьдзел у жыцьці партыі і ўсяго Савецкага краю. Зьезд—гэта калектыўны розум і воля ленінскай партыі і рабочае клясы. Тут, як у фокусе, зьбіраецца ўвесь багаты вопыт партыі, тут, пры дапамозе ленінскай тэорыі, памножанай на бальшавіцкую практыку, выкоўваюцца ўдасканаленыя мэтады работы і барацьбы. Генэральная лінія партыі—вось той асёнак, на якім правяраецца работа кожнай партыйнай арганізацыі, вось той цэнтр, вакол якога маналітнай сьцяной групуецца ўся партыя і ўся шматмільённая рабоча-сялянская маса.

Аб'яднаньне рэвалюцыйнага размаху з амэрыканскай дзелавітасьцю—вось стыль бальшавіцкай работы, які атрымлівае найбольшае яскравае выяўленьне ў рабоце зьезду партыі. Гэты стыль выключае крыклівасьць і пампэзнасьць, характэрную для зьездаў буржуазных партый. Бальшавікам, уся праца якіх на віду ў мільёнаў, няма ніякай патрэбы ў крывавай рэкляме.

Трынаццаты адкрыўся дзелавіта і скромна, бяз лішняй урачыстасьці. Тав. Гей, адзначаючы зьезд, у кароткіх словах абрысаваў галоўныя задачы зьезду. Працягам яго слоў былі словы на транспарантах і лёзунгах, што разьвешаны на сьценах залі «Дому Культуры». Тым, што сядзелі ў залі, былі зусім зразумелы і лёканізм уступнай прамовы, і словы лёзунгаў на сьценах. Гэта тое, што кожны з іх робіць на вялікіх і малых вучастках адзінага бальшавіцкага фронту.

Людзі, якія сядзяць у залі, не адзначаюцца тым, што прынята называць арыгінальнасьцю аблічча. Пінжакі, рабочыя блюзы, сьвіткі калгаснікаў і заграэльныя твары з большай ці з меншай колькасьцю маршчынак. Калі яны расседжваюцца ў залі і слухаюць дакладчыка, яны нагадваюць вось тую маналітнасьць, якую мы адчуваем, калі гледзім на Чырвоную армію. Ды тут і няма намыкі, бо тыя, што сядзяць у залі, кроўна зьвязаны з Чырвонай арміяй, самі прарабілі з ёю ўвесь пераможны шлях. Яны—авангард бальшавіцкай арміі.

Калі яны слухаюць даклад і на тварах застывае ўдумчывая сур'ёзнасьць,—на хвіліну можа здацца, што гэтым людзям не ўласьцівы па-камсамольску бурлівы ўздым.

Але вось, з прэзыдыуму чуюцца словы, у якіх упамінаецца імя **т. Сталіна...** І раптам заля «Дому Культуры» напаўняецца да-краёў гарачым прывітальным гулам паўтары тысяч дэлегатаў і гасьцей зьезду.

Гэта—бальшавікі вітаюць свайго прызнанага правадыра, нястомнага рулявога ленінскага ЦК— т. І. Сталіна. Гэта ён, умудраны ленінскім вучэньнем і практыкаю паўтарамільённай бальшавіцкай партыі, падводзячы вынікі году «вялікага пералому», кідаючы зрок у будучыню, гаварыў:

**— Мы ідзем на ўсіх парах па шляху індустрыялізацыі—да сацыялізму, пакідаючы ззаду нашу векавую «расійскую» адсталасьць. Мы становімся краем мэтальлёвым, краем аўтамабілізацыі, краем трактарызацыі. І, калі пасадзім СССР на аўтамабіль, а мужыка на трактар,—няхай папрабуюць даганяць нас шаноўныя капіталісты, якія кічацца сваёй «цывілізацыяй». Мы яшчэ паглядзімо, якія з краёў можна будзе тады адзначыць у адсталыя і якіх ў перадавыя».**

Гэтыя словы правадыра напісаны на адным з транспарантаў на сьцяне залі. Яны зьяўляюцца выражэньнем настрояў ня толькі XIII зьезду, але ўсяго неабдымнага Савецкага краю.

Быў яшчэ момант, калі энтузіязм залі перапоўніў яе да краёў. Гэта было тады, калі на трыбуну ўзышоў **т. Мануільскі** для дакладу **аб дзейнасьці ЦК УсеКП(б),** і сказаў.

**— Ад імя ЦК УсеКП(б) і Выканкому Камуністычнага Інтэрнацыяналу вітаю XIII зьезд і ў вашай асобе ўсіх працоўных БССР.**

Уся заля, як адзін чалавек, на працягу некалькіх хвілін стоячы адказвала на гэтыя словы гарачым адказным прывітаньнем. Гэта быў момант зьліяньня бальшавіцкіх пачуцьцёў у адзіным імкненьні ісьці да новых баёў і перамог пад сьцягам ЦК УсеКП(б).

Але быў другі момант, калі зьезд па хвіліну прыняў жалобны выгляд: з прэзыдыуму падалі паведамленьне аб раптоўнай сьмерці дэлегата зьезду ад Аршанскай акругі—старога бальшавіка-чэкістага т. **Мангуса.** Ён памёр на варце, зьбіраючыся прыняць удзел у выкрашэньні пытаньняў, што стаяць у парадку дня зьезду. Сьмерць ад разрыву сэрца не дазволіла яму зьдзейсьніць гэта жаданьне. Бальшавікі ня могуць плакаць нават пры самых цяжкіх стратах. Яны умеюць змагацца і заклікаць зьмест адышоўшых новыя батальёны байцоў.

***

На трыбуне т. Мануільскі. Яго даклад—марксыцка-ленінскі аналіз фактаў, лічбаў, падзей тут, у нас, і там, у краінах капіталу. Гэтыя факты і лічбы гавораць за нас, за СССР і супроць капіталізму, які курчыцца ў сударагах сусьветнага эканамічнага крызісу. Ідуць жорсткія клясавыя баі на ўсім міжнародным фронце. Мы б'ем ворага ўнутры, мы выкарчоўваем ад капіталізму савецкую глебу. І кожны наш удар разносіцца шматгалосым рэхам па земнай кулі. Пяцігодка—вось той цяжкі знарад, які ўзрывае капіталістычны сьвет. Нядаўна мы выстралілі па капіталізьме такой гранатай, як Турксіб. За ім ідуць Трактарбуд і Днепрабуд. Ёсьць і больш лёгкія знарады, якія, тым ня менш, б'юць па капіталізьме.

«Камунізм бродзіць на Эўропе... У выглядзе савецкай запалкі, савецкай фарбы. Апошнія зрабілі на капіталістычны сьвет такое ўражаньне, як-бы ў дварэц рымскага папы зьявіўся бязбожнік...»

Так гаварыў у сваім дакладзе т. Мануільскі, адзначаючы тую шалёную вайну супроць Савецкага экспарту, якую вядуць зараз Дэтэрдынг і Ко. Лёзунг «дагнаць і перагнаць» у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краі становіцца жывой рэальнасьцю. Ужо ў 1932 годзе мы выпускаем трактараў на 11 проц., больш, чым Амэрыка ў 1928 г. Тое-ж самае і ў адносінах да камбайнаў.

Мы ідзем на ўсіх парах на шляху да сацыялізму, пакідаючы ззаду нашу векавую «расійскую адсталасьць», узрываючы капіталізм пяцігодкай.

СССР!—гэтыя агнявыя літары, праізваючы чырвонымі праменьнямі эфір ў Бамбэі і Нью-Ёрку, у Бэрліне і Шанхаі, у Лёндане і ў Варшаве. І няма тэй сілы, якая-б магла патушыць сьвет магічных літараў.

Таму парукаю першамайскія дэманстрацыі і баі на вуліцах Парыжа, Лёндана, Берліна, Варшавы і Нью-Ёрку; таму парукаю гутны сялянскі рух, Чырвоная армія і Саветы ў Кітаі, крывавыя баі ў Бамбэі і Пэшэвары.

На дапамогу міжнароднай сацыялістычнай рэвалюцыі ідуць з Усходу яе пяжкія рэзэрвы. Мы ўсё бліжэй да таго моманту, калі зямля, стомленая пад цяжарам імперыялізму, пачуе малады, магутны, як сама рэвалюцыя, голас пралетарскага гымну:

Гэта ёсьць наш астатні
і рашаючы бой.

**Дваццаць** мільёнаў пралетараў, выкінутых на вуліцу зайшоўшым у тупік капіталізмам, падхапляюць гэты баявы вокліч.

«Буравесьнік» усё ніжэй і ніжэй спускаецца над капіталістычным сьветам.

***

Справаздача ЦК КП(б)Б ніжэ ўпершыню. Пакуль што дэлегатам раздаюць невялічкую кніжку пад назвай. «Матар'ялы да справаздачы Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б». У гэтай кніжцы ў аднолькавай меры зпойдзе для сябе матар'ял і гісторык і паэта. Тут, у выглядзе фактаў і лічбаў, сканцэнтравана работа партыі за год. Усе факты і ўсе лічбы гавораць аб адным: БССР шпаркімі крокамі «з краіны балот і адвечных казак» ператвараецца ў край сацыялістычнай індустрыі і зямляробства, у край сацыялістычнай культуры. Па сваіх тэмпах яна ідзе ў першых радох сярод брацкіх рэспублік Савецкага Саюзу.

**«Прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці ў 1929-30 годзе па сваім аб'ёме амаль што супадае з меркаваньнямі пяцігодкі на трэці яе год».**—Гэтыя радкі запазычаны з 15 старонкі названай вышэй кніжкі. Яны найлепшым чынам характарызуюць тэмпы БССР, і папулярнасьць лёзунгу сярод яе працоўных мас—Пяцігодку—за чатыры гады.

Возьмеце карту электрыфікацыі БССР; на ёй — густая сетка электрычных пунктаў. Гэта-энэргетычная база сацыялістычнай прамысловасьці і зямляробства Беларусі. За Асінбудам, які ў жніўні дасьць першы ток, ідзе другая раённая электрычная станцыя пад Гомелем, да пабудовы якой ужо прыступлена. Затым—трэцяя раённая.

На XII зьезьдзе т. Гамарнік у сваім дакладзе прыводзіў словы паэты, у якіх ён, ва ўпісон з партыяй, казаў:

Скора буду слухаць
Песьні Асінстрою,
Захапляюся музыкай турбін!

З тэй пары прайшоў год, краіна зрабіла яшчэ некалькі значных крокаў наперад, і вось музыка турбін Сталінбуду—ужо рэальны факт. Услед за горадам рушылася ў вялікі паход на новыя сацыялістычныя формы гаспадаркі беларуская вёска. Гэта ўжо зусім ня тая балотная, безданаможна - пасыўная Беларусь, аб якой так любяць гаварыць «самабытныя нацыянал-дэмакратыі». Гэта другая, маладая рабоча-сялянская **БССР,** поўная творчага энтузіязму і веры ў сваю перамогу, якая адкідае, як непатрэбнае сьмецьце, тэорыі нацыянал-дэмакратаў і іх саміх.

***

Сёньня рабоча-сялянская БССР рапартуе XIII зьезду. Рапарт—у бальшавіцкім стылі: рабочыя і калгаснікі арганізуюцца ў новыя ўдарныя брыгады, ударныя калгасы і саўгасы, пашыраюць пасеўную плошчу, выконваюць прамфінплян, уступаюць у рады партыі.

Так БССР і ўвесь край саветаў рыхтуецца да XVI зьезду УсеКП(б), аб'яднаны адным магутным лёзунгам:

**Пяцігодку—у чатыры гады.**

Армія мабілізавана. Ленінскі штаб—на варце. Порах—сухі. Мускулы байцоў гатовы да працы і бою.

Што-б ня здарылася—мы сьмела глядзімо ў будучыню.

Р. К.

# Узьнімаецца хваля рэвалюцыйных выступленьняў беспрацоўных супроць фашысцкай дыктатуры у Польшчы

## Масавыя пратэсты супроць арышту кам. дэпутата т. Жарскага

### УСЁ БОЛЬШ ВОСТРЫ ХАРАКТАР ПРЫМАЮЦЬ ДЭМАНСТРАЦЫІ

**ВАРШАВА, 26. Выступленьні беспрацоўных у Польшчы прымаюць усё больш востры характар.**

**У Сасноўцы беспрацоўныя ў ліку 1.000 чал. дэманстравалі супроць магістрату на працягу трох дзён. Беспрацоўныя актыўна супраціўляліся паліцыі, якая напала на дэманстрацыю. 13 беспрацоўных паранены і 23 арыштаваны. Цяжка паранены 6 паліцэйскіх і адзін прыстаў.**

**У Торне дэманстрацыі паўтараюцца за апошні час бесьперапынна, ахапляючы да 2.000 беспрацоўных. Гэтымі днямі беспрацоўныя прабавалі захапіць харчовыя крамы. У часе сутычак з паліцыяй 15 беспрацоўных паранена і 15 арыштаваны. На наступны дзень беспрацоўныя зноў прабавалі захапіць прадуктовыя крамы. 12 беспрацоўных было арыштавана.**

### ПАЛІЦЫЯ ЎЗБРОЙВАЕЦЦА «ГУМАННАЙ» ЗБРОЯЙ

ВАРШАВА, 26. Як паведамляе блізкае да афіцыйных колаў прыватнае агенцтва «Прэс», польская паліцыя мае ў сучасны момант «самы дасканалы род зброі — бомбы якія выклікаюць сьлёзы і атрутныя газы». Паводле інструкцыі, «газавыя бомбы могуць быць ужыты пры разгоне натаўпу, які пагражае грамадзкаму спакою і могуць быць выкарыстаны, як пад адкрытым небам, так і ў закрытых памяшканьнях». Агенцтва «Прэс» перадае разам з тым тлумачэньне афіцыйных колаў аб тым, што «ўдушлівыя бомбы, якія выклікаюць сьлёзы», зьяўляюцца самай гуманнай зброяй»...

### ХВАЛЯ АБУРЭНЬНЯ СУПРОЦЬ АРЫШТУ ТАВ. ЖАРСКАГА

**ВАРШАВА, 30. На імя польскага сойму атрыманы тэлеграмы з пратэстам супроць арышту камдэпутата Жарскага ад камфракцыі Бэльгійскага парляманту, ад рабкораў маскоўскай газэты (на польскай мове) «Трыбуна Радзецка» і ад польскіх эмігрантаў-гарнякоў у Францыі і г. д.**

### «НА ГЭТЫЯ ДУРНЫЯ ІНСЫНУАЦЫІ Я АДКАЗВАЦЬ НЯ БУДУ»

ВАРШАВА, 30. У сувязі з антысавецкім выступленьнем органу пілсудчыкаў «Газэта Польска», якая паведаміла, што дэпутат партыі эндэкаў Трампчынскі, разам з нябожчыкам т. Войкавым, быццам-бы, падрыхтоўваў замах на Пілсудскага, Трампчынскі апублікаваў у друку ліст, у якім піша: «друк пілсудчыкаў сьцьвярджае, што Войкаў, быццам-бы, наведваў мяне з мэтаю арганізацыі замаху на забойства Пілсудскага, якую (арганізацыю) прыпісвае Войкаву Бесядоўскі. На гэтыя дурныя інсынуацыі я адказваць ня маю памеру, павінен толькі канстатаваць, што мне няма чаго сароміцца маіх размоў з Войкавым аб польска-савецкіх адносінах. Гэтыя перагаворы садзейнічалі некатораму палепшэньню ўзаемаадносін паміж Польшчай і СССР і, можа быць, у будучым знойдуць лепшае прыстасаваньне, чым да гэтае пары».

У заключэньне Трампчынскі заяўляе, што аб сваіх размовах з Войкавым ён інфармаваў тагочаснага міністра замежных спраў Скшыньскага.

### «У СТАНЕ ПАРАЛЮШУ»

**ВАРШАВА, 26. Пэнээсаўскі орган «Работнік» зазначае, што прадстаўнікі буйнай прамысловасьці і фінансаў пічаць гаспадарчае становішча Польшчы «не крызісам, а падпадаючым пад параліюш».**

### «ЛЮБІМЫ ПАСЬЯНС ПІЛСУДЗКАГА»

ВАРШАВА, 29. Пэнээсаўскі сэнатар Струг (вядомы польскі пісьменьнік, які расхвальваў у сваіх творах Пілсудзкага) ў сувязі з апошнім адтэрміноўкай надзвычайнай сэсіі сойму заявіў наступнае: «На сойме Пілсудскі зрывае свае дрэнныя настроі: на ім міністэрства юстыцыі прабуе свае юрыдычныя машэнствы і падлогі». «Мы—заявіў Струг — жывем у выключнай атмасфэры. Кожны дзень мы знаходзімся перад якойсьці пастановай, якая ніколі не вырашаецца. Нас заўсёды трымаюць перад аблічам невядомасьці. У беспадобнай нашай сучаснасьці выклікае меркаваньне: па-першае, або Пілсудскі разглядае гульню сойму побач з любімымі пасьянсамі, або, па-другое, урадавы лягер напаў у тупік і ня ведае, што рабіць, ня ўмеючы справіцца з уладаю і ня ўмеючы кіраваць».

### ЗА НАВЕДВАНЬНЕ СССР—4 ГАДЫ КАТАРГІ

ВАРШАВА, 31. У Лодзі адбыўся судовы працэс 4-х членаў польскай рабочай дэлегацыі, якая езьдзіла ў СССР. Абвінавачаным інкрымінуецца прымінаежнасьць да камуністычнай партыі. Суд прыгаварыў абвінавачаных да 4 год турмы.

### БЕСПРАЦОЎНЫЯ ЗАХАПІЛІ СКЛАД

ВАРШАВА, 31. Беспрацоўныя ў Дамброве захапілі склад, які належыць мясцоваму магістрату, і забралі з яго ўсё збожжа.

## Барацьба палітвязьняў і рабоча-сялянскія масы Заходняй Беларусі

Усё вышэй уздымаецца хваля рэвалюцыйнае барацьбы рабочых і працоўных сялян Заходняй Беларусі. Усё часьцей становяцца выступленьні беларускіх сялян супроць падатковай палітыкі польскага фашызму, супроць камасацыі, супроць панскай акупацыі. Усё часьцей і вастрэй становяцца выступленьні рабочых і асабліва беспрацоўных у гарадох Заходняй Беларусі.

Польскі фашызм мабілізуе ўвесь свой апарат прыгнечаньня для задушэньня разгараючагася пажару рэвалюцыйнага руху у Заходняй Беларусі. Асабліва ў **Заходняй Беларусі** таму, што польскі фашызм надзвычайным тэмпам рыхтуецца да імпэрыялістычнай контр-рэвалюцыйнай вайны з Савецкім Саюзам, а Заходняя Беларусь будзе галоўным плядцармам гэтае вайны.

Таму фашызм узмацняе свой тэрор, таму ён кідае новыя тысячы лепшых сыноў рабочае клясы і рэвалюцыйнага сялянства ў турмы, таму ў турмах устанаўляецца забойчы рэжым для палітвязьняў, дзякуючы якому фашысцкія засьценкі Заходняе Беларусі і Польшчы поўнасьцю заслужылі назву «фабрык сьмерці».

Але дарма! Нават **у турмах вязьні капіталу ня спыняюць сваёй барацьбы, яны часта цаной свайго жыцьця, цаной сваёй крыві працягваюць барацьбу і ў сьцянах турмы.**

Палітвязьні раду турмаў адказваюць на бесьперапынныя атакі адміністрацыі на іх «правы» заўзятым супраціўленьнем. Барацьба палітычных вязьняў знаходзіць жывы водгук сярод працоўных мас, што на свабодзе.

Усе важнейшыя выступленьні палітвязьняў у Заходняй Беларусі, апошнімі месяцамі адбыліся пры актыўным удзеле рабочых і сялян Заходняй Беларусі. Мы тут падамо некаторыя даныя, якія вараз атрымалі аб барацьбе палітвязьняў ЗБ у сакавіку бягучага году.

У выніку надзвычай шкодных і жорсткіх гігіенічных умоў, якія пануюць у Беластоцкай турме, стан здароўя палітвязьняў вельмі няжкі. Лік сьмяротныхахвяр крывавага фашысцкага рэжыму ўсё больш узрастае. За кароткі пэрыяд часу ў Беластоку памерлі 2 хворыя на сухоты — т.т. **Вожняк і Аніч.** Фашысцкія забойцы адмаўлялі цяжка хворым вязьням у водпуску, сьвядома жадаючы іх закатаваць. У адказ на гэты два новыя забойствы палітвязьні ў **Беластоку** пачалі вострую кампанію пратэсту.

Абурэньне вязьняў было тым большае, што ў шпіталі знаходзілася цяжка хворая на сухоты т. **Райхэль,** якая таксама бяз выніку патрабавала водпуску для папраўкі стану здароўя. Палітвязьні на працягу **13 дзён** паладжвалі розныя выступленьні: сьпевы, неўставаньне на пераклічку і г. д. Адначасова арганізаваныя МОПР'у ў Беластоку арганізавала шырокую кампанію салідарнасьці і абароны палітвязьняў сярод шырокіх рабочых мас Беластоку. Наладжаны рад масавых сходаў у прафсаюзах і адзін пад адкрытым небам. На сходах гаварылася аб страшэнным турэмным рэжыме і аб сродках, якімі рабочыя масы могуць прыйсьці ў дапамогу вязьням фашызму. Усюды прымаліся вострыя рэзалюцыі пратэсту супроць фашысцкага турмовага статуту.

Адбылася дэманстрацыя пратэсту, у якой прымала ўдзел шмат соцен рабочых. На транспарантах былі лёзунгі: «Звольніць палітвязьняў», «Прэч з забойствам зьняволеных рабочых і сялян» і г. д. Дэманстрацыя ішла ў напрамку турмы, якая знаходзіцца далёка за гарадам. Па дарозе дэманстрацыя была разьбіта шматлікімі аддзеламі паліцыі.

Кампанія ў абарону палітвязьняў саўпала з тыднем «Парыскай Камуны». Патрабаваньне звальненьня палітзьняволеных стала таксама адным з патрабаваньняў беспрацоўных у часе шматлікіх дэманстрацый, якія адбыліся за апошні час у Беластоку.

Гэтая масавая кампанія ў абарону палітвязьняў устрымала на некаторы час турмовую адміністрацыю ад далейшых атак на «правы» зьняволеных рабочых і сялян. Паміж іншым, у часе кампаніі цяжка хворая т. **Райхэль** атрымала водпуск на кароткі час з турмы.

Палітвязьні Пінскай турмы былі прымушаны ў канцы сакавіка і ў пачатку красавіка да двухразовай галадоўкі на працягу аднаго тыдня. Канфлікт адбыўся з тае прычыны, што цяжка хворыя т.т., якія супраціўляліся закаванню іх у кайданы.

У канцы сакавіка адбыўся працэс 8-мі таварышоў — **Гэндляровіча, Крэйцэра** і інш. Калі іх павінны былі павесьці ў суд, паліцыя пачала гвалтам іх закоўваць у кайданы. Таварышы супраціўляліся. Паліцэйскія кінуліся на іх і цяжка іх зьбілі. На крык зьбіваных адазваліся магутнай дэманстрацыяй палітвязьні: білі ў дзьверы, сьпявалі інтэрнацыянал, ламалі мэблю і г. д. Палітвязьні патрабавалі спыніць закоўваньне ў кайданы і абсьледваньня зьбітых урачом.

На судзе абвінавачаныя, паказваючы на сьвежа завязаныя раны, вострa пратэставалі супроць біцьця і закоўваньня ў кайданы. Пракурор абяцаў, што закаваньне ня будзе ўжывацца, але гэтая заява аказалася хлусьнёй.

Пасьля сканчэньня судовага пасяджэньня, у гэты-ж дзень, пры выхадзе абвінавачаных з будынку суду, на сходах паліцыя кінулася на іх і зноў закавала іх у кайданы і зьбіла.

У адказ на гэтыя нячуваныя зьдзекі палітвязьні абвясьцілі галадоўку. Пракурор, які прыбыў на перагаворы, зноў абяцаў, што абвінавачаных павядуць у суд без кайданоў. Праўда, да канца працэсу т.т ужо больш не закоўвалі, але пракурор разам з турмовай адміністрацыяй праз два дні налажылі на іх кару за супраціўленьне пры закоўваньні. Палітвязьні зноў адказалі галадоўкі і кара была адменена.

У канцы сакавіка **адбыўся ў Спонімі працэс 26 беларускіх рабочых і сялян, якія абвінавачаліся ў прыналежнасьці да камуністычна партыі Заходняй Беларусі.** Фашысцкі суд прыгаварыў гэтых т. з. кожнага да 8, 6 і 4-х год катаргі. У знак пратэсту супроць гэтых драконаўскіх прыгавораў і супроць увядзеньня фашысцкага турэмнага статуту палітвязьні, у ліку 100 т.т., абвясьцілі «рабан» (салідарнае выступленьне палітвязьняў, воклічы лёзунгаў, шум, ламаньне мэблі і г. д.) і агульны сьпеў. Турмовая адміністрацыя пакарала палітвязьняў забаронаю прагулкі, газэт, спатканьняў, харчовае перадачы і г. д. Адносіны да адміністрацыі бязьмерна напружаныя. Штодня можна чакаць абвяшчэньня галадоўкі.

Турмовая адміністрацыя зрабіла замах на важнейшае права палітвязьняў —на права ўзмнага падзелу харчамі і кніжкамі, у камуне. Адабрана таксама бібліятэка ў палітвязьняў. Супроць гэтай забароны палітвязьні павялі кампанію пратэсту. На працягу 6 тыдняў яны адмаўляліся выходзіць на прагулку, карыстацца лазьняй, прымаць перадачу.

У **Горадні,** у Вільні і інш. турмах Заходняй Беларусі турмовая адміністрацыя ўжывае ўжо некалькі тыдняў новы сродак катаваньня палітвязьняў, які паніжае іх чалавечную годнасьць, які іх надзвычай н

# Напярэдадні XVI зьезду УсеКП(б)

## Пад сьцягам ленінізму, упэўненая ў парэмозе сацыялістычнага будаўніцтва, партыя ідзе да XVI зьезду

## Бязьлітасны, руйнуючы адпор усякім спробам справа і „зьлева" дыскрэдытаваць бальшавіцкую лінію ленінскага ЦК

## Гомельская арганізацыя да XIII зьезду

**ГОМЕЛЬСКАЯ** партыйная арганізацыя прышла да XIII зьезду КП(б)Б загартаванай у непрымірымай барацьбе за генэральную лінію партыі. Арганізацыя давала рашучы адпор усякім адхіленьням ад лініі партыі, асабліва праваму ўхілу, як галоўнай небясьпецы на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва. Непрымірыма змагаючыся з правым апартунізмам — галоўнай небясьпекай, Гомельская партыйная арганізацыя бязьлітасна біла па рэшках контрэвалюцыйнага трацкізму, па «левых» загібах і прымірэнцтве.

Выпсе кіраўніцтва Гомельскай арганізацыі ў сваёй практычнай рабоце дапусьціла рад буйных палітычных апартуністычных памылак на важнейшых вучастках работы (прарывы ў самакрытыцы, няправільныя пастановы па радзе рабкораўскіх спраў, правалы ў выкананьні прамфінплану і г. д.). Буйныя палітычныя памылкі былі дапушчаны і ў калгасным будаўніцтве.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту партыі партыйная арганізацыя рашуча выкрыла гэтыя памылкі і па-бальшавіцку ўзялася за іх выпраўленьне.

Падагульняючы рэзультаты гэтае работы, трэба канстатаваць рад рашаючых посьпехаў, дасягнутых Гомельскай партарганізацыяй. Значная частка заводаў і фабрык поўнасьцю ліквідавала прарыў у выкананьні прамфінплану. Многія прадпрыемствы цьвёрдым крокам ідуць да перавыкананьня прамфінпляну. Ударныя брыгады таксама правяралі адна другую, выяўляючы, наколькі ўдарнікі змагаюцца за ліквідацыю прарыву, наколькі яны ўцягваюць ва ўдарныя брыгады рэшту рабочых.

На прадпрыемстве адбылася агульнафабрычная канфэрэнцыя ўдарнікаў. Канфэрэнцыя падагуліла выпікі «налёту» на цэхі і брыгады. Дэлегаты канфэрэнцыі актыўна абмеркавалі пытаньне аб падрыхтоўцы да XVI зьезду УсеКП(б) і задачах рабочага калектыву. Канфэрэнцыя выбрала дэлегацыю для прывітаньня XIII зьезду КП(б)Б.

Члены і кандыдаты парт'ячэйкі перапілётнага цэху абвясьцілі сябе ўдарнікамі і ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва для прапрацоўкі матар'ялаў XIII зьезду КП(б)Б і падрыхтоўкі да XVI зьезду УсеКП(б).

Ячэйка перапілётнага цэху выклікала ячэйку машыннага цэху на сацыялістычнае спаборніцтва па наступных момантах:

1. Абавязваемся мабілізаваць увесь цэх на ліквідацыю прарыву ў выкананьні прамфінплану да XVI партзьезду. У перыяд да XVI зьезду УсеКП(б) мы будзем праводзіць «налёты» - праверкі на асобных ўдарных брыгадах, мы будзем правяраць як асобныя ўдарнікі-камунары, камуністы і камсамольцы змагаюцца за ліквідацыю прарываў да XVI зьезду УсеКП(б), выкрываючы іншэ-ўдарнікаў і прагульшчыкаў, ствараючы наўкола гэтага пытаньня грамадзкую думку.

2. Абавязваемся ўцягнуць лепшых перадавых ударнікаў сацыялістычнага спаборніцтва ў рады партыі, наперад праводзячы з імі парады і гутаркі, ставячы перад сабою канкрэтную задачу:

— Ні аднаго лепшага і прыкладнага, адданага сацыялістычнай вытворчасьці ударніка па-за радамі партыі.

3. Камуністы і камсамольцы бяруць на сябе ініцыятыву па зборы рабочых прапаноў, ставячы перад сабою задачу сабраць па перапілётным цэху да XVI зьезду партыі 200 прапаноў (на кожнага ўдарніка — адна прапанова).

4. Да XVI партыйнага зьезду ўсе павінны быць ўцягнуты ў актыўную работу ва ўсіх сэктарах цэхавай ячэйкі.

5. Правесьці шырокую работу па ўцягваньні ўсіх ударнікаў у прапрацоўку матар'ялаў партыйных зьездаў з тым, каб ні аднаго ўдарніка ня было па-за брыгадамі па прапрацоўцы матар'ялаў партызьезду.

**В. Л.**

## Віцебск рыхтуецца

ВІЦЕБСК (НАШ. КАР.). У **ВІЦЕБСК** ПРЫБЫЛІ ТАВАРЫШЫ, МАБІЛІЗАВАНЫЯ ЦЭНТРАЛЬНЫМ КАМІТЭТАМ КП(б)Б ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ НА МЯСЦОХ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ПАРТЫЙНЫХ ЗЬЕЗДАЎ. ПРЫБЫЎШЫЯ ТАВАРЫШЫ ЗЬВЯЗАЛІСЯ З МЯСЦОВЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ І РЭДАКЦЫЯМІ ГАЗЭТЫ **«ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ»**.

ГАРАДЗКІЯ РАЙКОМЫ ПАРТЫІ МАБІЛІЗАВАЛІ 50 ТАВАРЫШОЎ, ЯКІЯ ПРЫМАЦОЎВАЮЦЦА ДА ЗАВОДАЎ І ФАБРЫК ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА XVI ЗЬЕЗДУ УсеКП(б). НА ЗАВОДЗЕ **«ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТЫ»** ПРАВЕДЗЕНА НАРАДА ЦЭХАВАГА АКТЫВУ. СЯРОД РАБОЧЫХ ШЫРОКА РАСПАЎСЮДЖВАЮЦЦА ТЭЗІСЫ ДА XVI ЗЬЕЗДУ ПАРТЫІ. АРГАНІЗАВАНЫ ГРУПЫ ПА ЗБОРЫ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ У ПЫТАНЬНЯХ ЗНІЖЭНЬНЯ САБЕКОШТУ, ЛІКВІДАЦЫІ БРАКУ І ПАЛЯПШЭНЬНЯ ЯКАСЬЦІ ПРАДУКЦІІ. АРГАНІЗУЮЦЦА РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ ДЛЯ ПАЕЗДКІ Ў ПАДШЭФНЫЯ КАЛГАСЫ. БРЫГАДЫ ПРАВЯДУЦЬ У КАЛГАСАХ РАБОТУ ПА РАСТЛУМАЧЭНЬНІ ТЭЗІСАЎ І ПАДРЫХТОЎКІ ДА XVI ЗЬЕЗДУ ПАРТЫІ. БРЫГАДЗІРЫ БУДУЦЬ ЗНАЙМІЦЬ КАЛГАСЬНІКАЎ З РАБОТАЙ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б.

НА ЗАВОДАХ І ФАБРЫКАХ СКЛІКАЮЦЦА НАРАДЫ РАБКОРАЎ. ГЭТЫМІ ДНЯМІ АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭНЬНЕ АКРУГОВАГА ШТАБУ СУПОЛЬНА З МАБІЛІЗАВАНЫМІ ЦК ТАВАРЫШАМІ І РЭДАКТАРАМІ НАСЬЦЕНГАЗЭТ ПА ПЫТАНЬНІ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА XVI ЗЬЕЗДУ УсеКП(б). НАРАДА АБМЕРКАВАЛА ПРАПАНОВУ АБ ВЫПУСКУ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ ЦЭХАВЫХ «ІЛЬЛІЧОВАК», ПРЫСЬВЯЧАНЫХ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА XVI ЗЬЕЗДУ ПАРТЫІ. НА ЗАВОДАХ І ФАБРЫКАХ АДБЫЛІСЯ МАСАВЫЯ МІТЫНГІ, НА ЯКІХ РАБОЧЫЯ ПРЫНЯЛІ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ПА ПЕРАВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ І ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ ДА XVI ЗЬЕЗДУ ПАРТЫІ.

## 200 ударнікаў—у КП(б)Б

**ГОМЕЛЬ.** (Наш карресп.).

На заводзе імя **Ланцуцкага** разгортваецца вялікая работа па падрыхтоўцы да XVI зьезду УсеКП(б). На заводзе ў сувязі з XIII зьездам КП(б)Б і XVI зьездам УсеКП(б) удзелу маг[illegible] гутны ўздым [illegible] рашучка была сарвана. [illegible]ваецца ма[illegible]

Такое-ж [illegible] рабочай масы. Рабочыя Так, [illegible] паставілі пытаньне аб поўнай ліквідацыі прарываў і перавыкананьні прамфінпляну да XVI зьезду партыі. У паравозна - зборачным цэху адбыўся масавы мітынг, прысьвечаны XIII зьезду КП(б)Б. Паравозна-зборачны цэх даў слова выпусьціць да XIII зьезду партыі звыш пляну адзін паравоз.

Вагонны цэх на сваім мітынгу пастанавіў да XVI зьезду УсеКП(б) ліквідаваць майскі прарыў і поўнасьцю выканаць прамфінплян за ўсе папярэднія месяцы. Рабочыя мэханічнага цэху ўхвалілі рад канкрэтных мерапрыемстваў па паляпшэньні работы. У цэхах ствараюцца ўдарныя брыгады імя XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б).

Камсамольская арганізацыя заводу абвяшчае агульна-асьвітны [illegible] гадзіны працоўць у цэхах. Сьветлыя [illegible] ясьцяла сябе мабілізаванай на барацьбу за перавыкананьне прамфінпляну да XVI зьезду партыі. На заводзе арганізуюцца брыгады і гурткі па прапрацоўцы тэзісаў да XVI зьезду УсеКП(б).

Партыйная арганізацыя заводу ідзе да XVI зьезду УсеКП(б) адзінай і згуртаванай, усё больш узмацняючы сувязь з рабочай масай. Уздым заводзкіх рабочых у сувязі з XIII зьездам КП(б)Б і XVI зьездам УсеКП(б) выразна сьведчыць аб тым, што партыйная арганізацыя моцна зьвязана і і ўзмацняе няўхільна сваю сувязь з масамі. 200 рабочых - ударнікаў, уступіўшых за апошні час у рады арганізацыі, зьяўляюцца новым магутным зьвяном гэтай непарыўнай сувязі.

**Н. К.**

## Баявым тэмпам

Партыйная ячэйка **«Папесдруку»** актыўна рыхтуецца да XVI зьезду УсеКП(б). У падрыхтоўчую работу ўцягнуты ўсе беспартыйныя рабочыя і работніцы. Падрыхтоўка праводзіцца шляхам сацыялістычнага спаборніцтва. Рабочая маса прадпрыемства на чале з партыйнай ячэйкай абавязалася да XVI зьезду УсеКП(б) ліквідаваць прарыў у выкананьні прамфінпляну і перавыканаць вытворчую праграму.

На рабочых цэхавых сходах выпрацаваны канкрэтныя меры для ліквідацыі прарыву і перавыкананьня прамфінпляну да XVI зьезду партыі. 26 мая былі праведзены масавыя «налёты» цэхаў адзін на другі. Кожны цэх правяраў, наколькі другі цэх на справе вядзе барацьбу за перавыкананьне прамфінпляну. Ударныя брыгады таксама правяралі адна другую, выяўляючы, наколькі ўдарнікі змагаюцца за ліквідацыю прарыву, наколькі яны ўцягваюць ва ўдарныя брыгады рэшту рабочых.

На прадпрыемстве адбылася агульнафабрычная канфэрэнцыя ўдарнікаў. Канфэрэнцыя падагуліла выпікі «налёту» на цэхі і брыгады. Дэлегаты канфэрэнцыі актыўна абмеркавалі пытаньне аб падрыхтоўцы да XVI зьезду УсеКП(б) і задачах рабочага калектыву. Канфэрэнцыя выбрала дэлегацыю для прывітаньня XIII зьезду КП(б)Б.

Члены і кандыдаты парт'ячэйкі перапілётнага цэху абвясьцілі сябе ўдарнікамі і ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва для прапрацоўкі матар'ялаў XIII зьезду КП(б)Б і падрыхтоўкі да XVI зьезду УсеКП(б).

Ячэйка перапілётнага цэху выклікала ячэйку машыннага цэху на сацыялістычнае спаборніцтва па наступных момантах:

1. Абавязваемся мабілізаваць увесь цэх на ліквідацыю прарыву ў выкананьні прамфінпляну да XVI партзьезду. У перыяд да XVI зьезду УсеКП(б) мы будзем праводзіць «налёты» - праверкі на асобных ўдарных брыгадах, мы будзем правяраць як асобныя ўдарнікі-камунары, камуністы і камсамольцы змагаюцца за ліквідацыю прарываў да XVI зьезду УсеКП(б), выкрываючы іншэ-ўдарнікаў і прагульшчыкаў, ствараючы наўкола гэтага пытаньня грамадзкую думку.

2. Абавязваемся ўцягнуць лепшых перадавых ударнікаў сацыялістычнага спаборніцтва ў рады партыі, наперад праводзячы з імі парады і гутаркі, ставячы перад сабою канкрэтную задачу:

— Ні аднаго лепшага і прыкладнага, адданага сацыялістычнай вытворчасьці ударніка па-за радамі партыі.

3. Камуністы і камсамольцы бяруць на сябе ініцыятыву па зборы рабочых прапаноў, ставячы перад сабою задачу сабраць па перапілётным цэху да XVI зьезду партыі 200 прапаноў (на кожнага ўдарніка — адна прапанова).

4. Да XVI партыйнага зьезду ўсе павінны быць ўцягнуты ў актыўную работу ва ўсіх сэктарах цэхавай ячэйкі.

5. Правесьці шырокую работу па ўцягваньні ўсіх ударнікаў у прапрацоўку матар'ялаў партыйных зьездаў з тым, каб ні аднаго ўдарніка ня было па-за брыгадамі па прапрацоўцы матар'ялаў партызьезду.

**В. Л.**

# Важнейшы вучастак партыйна-савецкай работы

**А. Хацкевіч**

**Не абмяжоўваючыся фармальным раўнапраўем жанчын, партыя імкнецца вызваліць іх ад матар'яльных цяжот устарэлай хатняй гаспадаркі, шляхам замены яе дамамі-камунамі, грамадзкімі сталоўкамі, цэнтральнымі прапьнямі, ясьлямі і г. д.**
**(З праграмы камуністычнай партыі)**

Важнейшыя гістарычныя задачы, пастаўленыя нашай партыяй перад краінай Саветаў па сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, ажыцьцяўленьні масавай калектывізацыі бядняцка - серадняцкіх гаспадарак і ліквідацыі кулацтва, як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі, па перабудове быту працоўных мас на сацыялістычных падставах, правядзеньне культурнае рэвалюцыі — патрабуюць ад нас, ад партыйных і савецкіх органаў правільнага і поўнага скарыстаньня творчай актыўнасьці найпярэйшых працоўных мас, бо посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве могуць і будуць забясьпечаны толькі пры ўмове арганізаванасьці, энтузіязму і творчай ініцыятывы рабочае класы і асноўных мас працоўнага сялянства, пад гэніяльным кіраўніцтвам нашай Ленінскай Камуністычнай партыі.

Мы бачым, як усё больш і больш ўдзел у агульным сацыялістычным будаўніцтве займае працоўная жанчына; але гэты ўдзел выяўляецца яшчэ недастатковым у параўнаньні з тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва наогул і асабліва на вёсцы. Тут яшчэ вельмі шмат непачатай працы. Ва ўмовах-жа сучаснага перыяду абвастрэньня клясавай барацьбы, работа па арганізацыі і арганізацыйным замацаваньні, пашырэньні і скарыстаньні ўзросшай актыўнасьці работніц, батрачак і бядняцка-серадняцкіх мас сялянак, набывае зараз асабліва важнае палітычнае значэньне. Калі і да гэтага часу яшчэ наглядаюцца пассобныя выпадкі скарыстоўваньня антысавецкіх элементамі будучых барацьбу за сацыялізм. [illegible] элементамі [illegible] адсталых пластоў працоўных жанчын для перанос мерапрыемстваў партыі і савецкай улады, — дык гэта тлумачыцца галоўным чынам слабай арганізацыйна - масавай і культурна-асьветнай працай сярод шырокіх мас жанчын гораду і вёскі. І таму, каб арганізаваць і правільна накіраваць узросшую актыўнасьць мас работніц, батрачак і сялянак - бяднячак і сераднячак на практычны ўдзел іх у шырокай сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, на ўдзел у калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, неабходна прыстасаваць, ужыць усе формы і мэтады работы сярод жанчын, скарыстоўваючы ўсе сілы і магчымасьці на ўцягненьне ўсіх працоўных жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва, на вышчэньне рэштак заняволеньня жаночай працы. Трэба дабіцца ўвязкі ўсіх мерапрыемстваў па паляпшэньні працы і быту працоўных жанчын з тымі вялікімі тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва, што пасьпяхова ажыцьцяўляюцца ў нашай краіне. Толькі так трэба зараз ставіць пытаньне ў працы сярод жанчын — сярод працоўнага, раней найбольш прыгнечанага, жаночага насельніцтва, якому камуністычная партыя і савецкая ўлада, дзякуючы Кастрычніцкавай рэвалюцыі, надалі правы і поўную мажлівасьць удзельнічаць у вялікім будаўніцтве сацыялізму ў нашай краіне.

З усяго гэтага і вынікаюць задачы партыйных органаў, саветаў і іх бытавых камісій у справе шырокага разгортваньня працы сярод усёй працоўнай масы жанчын. Прычым арганізаваць і паставіць працу сярод жанчын па-сучаснаму ў парадку плянаў і сыстэмы нашай штодзённай працы, адкінуўшы ў бок усякую бяссістэмнасьць, парадпасьць і наскокі ў гэтай важнейшай працы арганізацыйнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Неабходна зараз, як сьлед, узяцца за сыстэматычнае вывучэньне і вырашэньне пытаньняў больш шырокага ўцягненьня працоўных жанчын у прамысловасьць, паставіўшы на належную вышыню сыстэматычную плянавую падрыхтоўку кадраў жаночай кваліфікаванай сілы праз спэцыяльныя і агульныя курсы. Трэба паставіць пытаньне навуковага дасьледваньня жаночай працы ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы з тым, каб найлепшыя дасягненьні навукі і тэхнікі, якія запраўды паляпшаюць працу і быт жанчыны, маглі быць шырока і безадкладна скарыстаны ва ўсіх галінах нашага будаўніцтва, нашага савецкага, пралетарскага быту.

Важнейшай галінай працы сярод працоўных жанчын вёскі зьяўляюцца неабходнасьць усебаковага садзейнічаньня справе шырокай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, **як адзіна правільнага і рэальнаму сродку, які разьнявольвае працоўную сялянку,** запраўды паляпшае яе быт. Пры гэтым неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на калектывізацыю працы і паляпшаньне быту жанчын у калгасах і саўгасах, на пабудову там грамадзкіх сталовак, прачатных, дзіцячых ясьляў, пляцовак, майстэрань і г. д., каб усё гэта было прыкладам і спрыяла суцэльнай калектывізацыі ўсіх іншых яшчэ раскіданых адзіначлічных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі.

Скарыстоўваючы жаночую працу ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі, неабходна дабіцца магчымаю большай мэханізацыі і рацыяналізацыі жаночай працы. Трэба ўсямерна дабівацца і садзейнічаць арганізацыі спэцыяльных жаночых першапачатковых калектыўных аб'яднаньняў адзіначліц і шырокай кантрактацыі, правільнага скарыстаньня іх прадукцыі. У працы сярод калгасьніц, паляпшаючы ўмовы іх працы і быт, неабходна зьвярнуць увагу на інтэрнацыянальнае выхаваньне, уцягваючы ў гэта выхаваньне, а таксама ў працу калектыўнага выхаваньня і абслугоўваньня дзяцей батрачак, бяднячак і сераднячак-сялянак, не ўвайшоўшых яшчэ ў калгасы.

Новае гарадзкое жыльлёвае будаўніцтва павінна поўнасьцю **забясьпечваць моманты капітывізацыі быту,** утварэньне бытавых устаноў вызначэньнем адпаведнай плошчы згодна законаў Савецкай улады. Аднак, трэба адзначыць, што нашы будаўнічыя арганізацыі часта праяўляюць недапушчальную няўважлівасьць да гэтае справы і таму трэба ім, Жакам, як многім нашым арганізацыям і ўстановам і нават цэлым некаторым акругам, напомніць наступныя словы У. І. Леніна: **«Запраўдае вызваленьне жанчыны, запраўдны камунізм пачнецца толькі там і тады, дзе і калі пачнецца масавая барацьба (іруемая ўпадаючым дзяржаўнай уладай[illegible] рыятам) супроц[illegible]** Трэ[illegible] пралетар[illegible] гэтай дробнай хат[illegible] гаспадаркі, ці вярней масавая перабудова яе ў буйную сацыялістычную гаспадарку. Ці дастаткова ўвагі ўдзяляем мы на практыцы гэтаму пытаньню, якое тэарэтычна бясспрэчна для кожнага камуністага? Бязумоўна, не. Ці дастаткова клапатліва адносімся мы да парастканў камунізму, якія ўжо зараз маюцца ў гэтай галіне? Яшчэ раз не і не. Грамадзкія сталоўкі, ясьлі, дзіцячыя сады—вось узоры гэтых парасткаў, вось тыя простыя буднічныя, нічога пышнага, паважнага, урачыстага не ўяўляюць сродкі, якія на справе здольны вызваліць жанчыну, на справе здольны палепшыць і зьнішчыць яе няроўнасьці з мужчынай па яе ролі ў грамадзкай вытворчасьці і грамадзкім жыцьці». (Ленін, т. XVI, стар. 256).

Вось як характарызаваў тав. Ленін нашу нядбайнасьць і як ён ацэньваў бытавыя ўстановы «парасткі камунізму».

У справе арганізацыі бытавых устаноў вялікую ролю адыгрывае грамадзкая ініцыятыва, самадзейнасьць саміх працоўных мас, актыўнасьць і сьвядомасьць самых працоўных жанчын. Але разам з гэтым патрэбны сродкі, патрэбна дапамога дзяржаўных устаноў і грамадзкіх арганізацый. У дадатак да асыпаваньняў на бытавыя ўстановы на лініі дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў, законадаўствам Уралу прадугледжан рад розных адлічэньняў у зваротах каапэрацыйных і гаспадарчых арганізацый. На жаль, гэтыя грошы не заўсёды своячасова, рацыянальна, поўнасьцю і па прызначэньні скарыстоўваюцца. Тут віна ня толькі кіраўнікоў устаноў, якія няправільна і несваячасова выдаткоўваюць сродкі на патрэбы бытавых устаноў, але і саміх бытавых камісій, саветаў і ўсіх тых арганізацый, якія павінны сыстэматычна сачыць за правільнасьцю адлічэньняў і скарыстоўваньнем сродкаў палепшаньня быту. Бытавыя камісіі саветаў і выканкомаў павінны ўдзельнічаць ва ўсіх бюджэтных пасяджэньнях, парадах і дабівацца павялічэньня сродкаў на бытавыя ўстановы. Гэта іх абавязак.

Бытавыя камісіі павінны сыстэматычна рабіць праверку і агляд становішча культурна-бытавых устаноў, а таксама правяраць работу ўстаноў і прадпрыемстваў у галіне разьвіцьця ўсіх мер па палепшаньні працы і быту. Зараз наша прамысловасьць пераходзіць на бесьперапынку. У зьвязку з гэтым перад грамадзкімі арганізацыямі і бытавымі камісіямі стаіць важнейшая задача забясьпечыць бытавымі ўстановамі работніц бесьперапыннай вытворчасьці нашых фабрык і заводаў. Нам трэба дапасаваць культурна бытавыя ўстановы да больш поўнага абслугоўваньня жанчын-работніц і сялянак ня толькі ў час іх работы на прадпрыемстве, на працы сельска-гаспадарчай вытворчасьці: калгасу, саўгасу, вёскі, але і ў часе іх грамадзкай работы і вучэбных заняткаў, асабліва калі прыняць пад увагу няпісьменнасьць, малапісьменнасьць і слабы ўдзел яшчэ жаночай масы ў грамадзкім будаўніцтве. у працы саветаў. Неабходна прыняць рашучыя захады з боку савецкіх устаноў і грамадзкіх арганізацый да поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці сярод працоўных жанчын, падрыхтоўваючы кадры ліквідатараў няпісьменнасьці з саміх работніц, батрачак, бяднячак і актывістак-сераднячак. Разам з гэтым трэба ўтварыць спэцыяльныя фонды дапамогі дзецям батрацтва і беднаты, каб гэтым самым праз дапамогу даць магчымасьць усім дзяўчынкам бяднейшых бацькоў наведаць школу.

У справе вылучэньня жанчын работніц, батрачак, бяднячак і сераднячак-актывістак па кіруючую працу ў савецкіх установах і грамадзкіх арганізацыях мы маем вялізарныя посьпехі. Аднак, гэта вельмі мала да сапраўдна-поўнага выканаваньня дырэктыў партыі. Некаторыя ўстановы, нават цэнтральныя, пачынаюць забываць партыйныя дырэктывы і пастановы ўраду пра вылучэньне жанчын і належнае іх выхаваньне на адказнай кіруючай працы. Вылучэньне і падрыхтоўка жаночых кадраў для працы ў савецкім апараце і грамадзкіх органах патрабуюць ад нас значна большай увагі. Агульныя і спэцыяльныя жаночыя курсы па падрыхтоўцы ніжавых работнікаў у цэнтры і акругах павінны быць лепш пастаўлены ў сэнсе падбору слухачак, і ў сэнсе арганізаванасьці і якасьці заняткаў. Вылучэньне жанчын, як і наогул на кіруючую працу павінна стаць справай шырокай грамадзкасьці. Нельга дапушчаць габінэтнага вылучэньня бяз удзелу шырокіх мас працоўных, асабліва самих жанчын, іх шырокага актыву. Трэба стварыць найлепшыя ўмовы працы для вылучаных таварышоў жанчын [illegible] грамадзкіх установах.

Барацьба супроць рэлігійных забабонаў, знахарства — у працы сярод жанчын павінна займаць адно з важнейшых і адказьнейшых месц. Нашы арганізацыі бязбожнікаў у сваёй працы павінны больш удзяляць увагі антырэлігійнай прапагандзе сярод шырокіх працоўных мас жанчын. Павялічыць у палітычна - выхаваўчай працы колькасьць лекцый, гурткоў, гутарак па антырэлігійнай пропагандзе з мэтай канчатковага зьнішчэньня рэлігійнага ўплыву на пасьнныя пласты працоўных жанчын у нацыянальнасьцях і падняцьця іх літычнага і культурнага ўзроўню. Д[illegible] вырашэньня гэтых задач неабходна [illegible] сьлед арганізавацца перш за ўсё сам[illegible] бытавым камісіям.

У зьвязку з праведзенай рэарганізацыяй партапарату, што перабудавала апарат і працу жанаддзелаў, трэба [illegible] толькі не паслабляць непасраднага [illegible] раўніцтва з боку парторганаў у адно[illegible] нах да працы сярод жанчын, а наадва[illegible] рот, ёсьць поўная неабходнасьць узма[illegible] ніць парткіраўніцтва ў гэтай галіне пр[illegible] цы.

Савецкі апарат, бытавыя камісіі, сэ[illegible] цыі, грамадзкія арганізацыі павінны зьвязку з рэарганізацыяй партапарат[illegible] **ўзяць на сябе ўвесь цяжар канкрэтна[illegible] працы па сапраўдным стварэньні леп[illegible] шых умоў працы, па палепшаньні бы[illegible] ту працоўных жанчын.** Так стаіць спра[illegible] ва. З гэтага трэба зыходзіць савецкім [illegible] грамадзкім установам у сваёй працы [illegible] сустракаючыся з тымі ці іншымі пы[illegible] таньнямі работы сярод жанчын. Сур'ёз[illegible] на і ўважліва трэба адносіцца да пы[illegible] таньняў усіх мерапрыемстваў бытавога разьвяволеньня працоўных жанчын. Трэба больш адпусьціць сродкаў, больш накіроўваць сіл на гэту справу. Задача центральных савецкіх установ выра[illegible] шыць у бліжэйшыя часы пяцігадовы плян палепшаньня працы і быту жанчын, што дасьць падставу для сыстэматычнага канкрэтнага вырашэньня ўсяго пытаньня.

Сацыялістычнае спаборніцтва павінна займаць вялікае месца ў працы сярод жанчын. Для забясьпечаньня пасьпяховасьці масавай і бытавой работы сярод жанчын, неабходна больш шырока разгарнуць крытыку і самакрытыку перш за ўсё праз друк, што дасьць нам магчымасьць своячасова выкрываць усе недахопы, памылкі і хібы, паставіць на належную вышыню палепшаньне працы і быту жанчын, уцягненьне шырокіх мас працоўных жанчын у актыўнае будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

## У падарунак бальшавіцкаму зьезду

### часьці БВА даюць перавыкананьне пляну баяво вучобы, упарныя тэмпы і высокую якасьць

### Расьцем за лік лепшых чырвонаармейцаў

Партыйная арганізацыя ўдарнага №-га артылерыйскага палка згуртаванымі радамі ідзе да XVI зьезду УсеКП(б). Партарганізацыя карыстаецца шырокім аўтарытэтам у чырвонаармейскай масы. Наша палкавая арганізацыя расьце за лік рабочых, батракоў, беднякоў і калгаснікаў. За апошні час у палку паданы 62 заявы аб уступленьні ў партыю. На мінулым палкавым сходзе разгледжана 31 заява аб прыёме ў кандыдаты — усе прыняты, як прыкладныя байцы і камандзіры. З прынятых ёсьць таварышы, прайшоўшыя стадёвае загартаваньне ў часе грамадзянскай вайны і як добрыя выхавацелі і настаўнікі чырвонаармейцаў.

Партарганізацыя сваю лінію ў падрыхтоўцы да XVI зьезду, як і да гэтага часу, яшчэ больш накіравала да замацаваньня баяздольнасьці і баявой гатоўнасьці палка.

Галоўным месцам, патрабуючым узмацненьня ў нашай вучобе, зьяўляецца стралковая і палітычная падрыхтоўка. На адным з папырэдніх партсходаў прыняты рашучыя пастановы да зьнішчэньня слабых месц, якія часткова ёсьць у некаторых разьдзелах па баявой падрыхтоўцы: па сапраўднай хуткасьць дывізіёнаў да сустрэчнага бою, да адкрыцьця агню, давёўшы гэтае выкананьне да 27 мін., батарэі — да 10-12 мін. Дабіцца, каб аддзяленьне сувязі з пяхотай (АСП) не адставала ад стралковых разьдзелаў і ня губіла сувязі ў самых складаных умовах абстаноўкі і пры самых хуткіх тэмпах прасоўваньня пяхоты. Зусім зьнішчыць пасаваньне конскага складу, добра падганяючы амуніцыю і як мага хутчэй ўзяць правільную сядлоўку.

Распачаўшы ўжо поўную вучобу з прыпоўным пазаўнешнем пакаранчага збору, партарганізацыя палка вынесла рад пастаноў на добрую якасьць правядзеньня з маладымі байцамі заняткаў з такім разьлікам, каб іх да тэрміну выезду на стрэльбу ўжо падрыхтаваць.

У выніку павароту партыйнай арганізацыі тварам да баявой падрыхтоўкі, нашы посьпехі значна павысіліся, напрыклад, у некаторых разьдзелах, як школе і іншых, вызначэньне бусолі было за 19 сэкунд, а цяпер дасягаецца за 14-12 сэкунд. Растаноўка бусолі ў асноўнае становішча рабілася раней за мінуту і больш, а цяпер утвараецца за 50-45 сэкунд. Гэтыя посьпехі ёсьць таму, што ўдарніцтва і сацспаборніцтва стала асноўным штуршком і правілам байцоў да паваротлівасьці і ўцягненьня пры сталым кіраўніцтве партарганізацыі палка. Да прапрацоўкі ў палку пастаноў XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б), а таксама акруговае канфэрэнцыі БВА складзены групы з уцягненьнем беспартыйных. Тэзісы ўжо распрацоўваюцца на сходах падзелаў.

**А. Ф. А.**

### Падкаваць ленінскім словам

У часе дывізійнай і акруговай партканфэрэнцыі БВА ў палку ўступіла ў партыю 61 чал. Для таго, каб іх падрыхтаваць, арганізаваны групы для тэарэтычнай падрыхтоўкі.

У праграму гэтых груп увайшло і вывучэньне статуту і праграмы партыі, апошнія пастановы ЦК нашай партыі па калгасным руху, вывучаюцца артыкулы тав. Сталіна «Головокружение от успехов» і «Ответы товарищам колхозникам».

У сувязі з надыходзячымі партыйнымі зьездамі ў праграму ўключаны пытаньні гэтых зьездаў і будуць прапрацаваны перадзьездаўскія матар'ялы.

Маладыя чырвонаармейцы вельмі зацікаўлены гэтымі заняткамі і добра наведваюць гурткі.

Так, маладыя камуністы ў радах Чырвонай армії ўзбройваюцца ленінскім словам для сваёй будучай практычнай работы.

**В. Р.**

# Барацьба супроць апартунізму ў пэрыяд паміж XV і XVI зьездамі УсеКП(б)*)

Апартунізм ня ёсьць праяўленьне ваганьняў і хістаньняў, скажэньне партыйнай лініі ў якім-небудзь асобным пытаньні. Апартунізм ёсьць цэлая сыстэма погляду. Ён праяўляецца ў самых розных галінах. Разьвіваючыся, ён захапляе ўсе абсягі партыйнага жыцьця, партыйнага будаўніцтва, — абсяг ідэалёгіі і абсяг практыкі. Таму апартунізм праявіўся і ў такім абсягу, як дзейнасьць прафсаюзных арганізацый. На VIII зьезьдзе прафсаюзаў (сьнежань 1928 г.) апартуністы прабавалі процістаўіць сябе кіраўніцтву ЦК. Камфракцыя УсеЦСПС, якая сабралася пасьля VIII зьезду прафсаюзаў па дакладу тав. Дагадава на 2 пленуме УсеЦСПС павінна была канстатаваць буйнае разгалосьце правай апазыцыі з партыяй па пытаньні аб прафэсыянальным руху. Мы напамінаем важнейшую частку гэтай пастановы фракцыі УсеЦСПС, бо яна ў асноўным фармулюе важнейшыя пытаньні разгалосьсяў партыі з апартуністымі ў пытаньнях прафэсыянальнага руху.

«Фракцыя канстатуе, што барацьба партыі за правільную ленінскую лінію сустрэла супраціўленьне часткі прафэсыяналістых. Неабходнасьці перабудовы радоў і мэтадаў работы прафэсыянальных саюзаў у пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі і наступленьня пралетарыяту як у горадзе, так і ў вёсцы, рашучага зьнішчэньня сур'ёзных недахопаў прафруху не зразумела гэта частка прафэсыяналістых.

Замест мабілізацыі мас на перамаганьне труднасьцяй рэканструкцыйнага пэрыяду — панікёрства перад гэтымі труднасьцямі; замест шырока разгорнутай работы па ўцягненьні мас рабочых і работніц у гаспадарчае будаўніцтва ў працэсе сацыялістычнай рацыяналізацыі, у барацьбу за павышэньне прадукцыйнасьці працы, за працоўную дысцыпліну — спробы прыкрываньня цэхавых інтарэсаў і настрояў адсталых пластоў рабочае клясы; замест рашучага і пасьлядоўнага разгортваньня пралетарскай самакрытыкі ў прафсаюзах — фармулёўкі і агаворкі, заклікаючыя да асьцярожнасьці ў справе разгортваньня самакрытыкі, тармозячыя разьвіцьцё актыўнасьці мас у барацьбе з бюракратызмам і скажэньнямі ў прафсаюзах, разлажэньнем асобных зьвяньняў прафапарату, з адрывам іх ад мас.

Замест узмацненьня пралетарскага ўплыву на вёску і дапамогі з боку прафсаюзаў сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі — імкненьне да абмежаваньня ролі прафсаюзаў у вёсцы і культываваньне іх замкнутасьці, што ў прыватнасьці выявілася ў слабым уплыве прафсаюзаў на грамадзкую работу вёскі, недаацэнцы работы сярод батрацтва і г. д.; замест шырокай п

# Да XVI зьезду УсеКП(б)—плян да варштату

## НІ АДНАГО РАБОЧАГА БЯЗ ПЛЯНАВАГА ЗАДАНЬНЯ

### ЗАБІЛІЗУЕМ УВАГУ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ НА ВЫКАНАНЬНЕ ГЭТАЙ ВАЖНЕЙШАЙ ЗАДАЧЫ

### ДА ЗЬЕЗДУ ЗАСТАЛОСЯ ДВА ТЫДНІ

Вытвор[illegible] на [illegible]а пасажырскага цэху вагонных майстэрняў на чале [illegible]ком т. Плоцыным

## Бярэце прыклад з лепшых

Не на ўсіх менскіх прадпрыемствах справа з давядзеньнем прамфінпляну да варштату абстаіць дрэнна. Ёсьць прадпрыемствы, дзе ў гэтым напрамку праведзена больш-менш здавальняючая работа.

Напрыклад, на швэйнай фабрыцы «Кастрычнік». Прамфінплян абгаворваўся на агульных і цэхавых сходах рабочых, на вытворчых нарадах, па сходах рабочых агрэгатаў. Але аднаго абгаварэньня мала. І кожнаму цэху, кожнаму агрэгату вызначаны іх прамфінпляны і адпаведныя заданьні. З другога боку—аб выкананьні заданьняў рабочыя інфармуюцца штодзенна, шляхам насьценных зводак. Ці не таму вытворчая праграма на фабрыцы «Кастрычнік» выкананa за паўгодзьдзе на 103,27 проц., за красавік і май на 113 проц., а сабекошт зьніжаны за паўгодзьдзе на 12,96 проц. замест 11,7 проц. паводле прамфінпляну? Можна сказаць упэўнена, што асноўны шлях, які прывёў фабрыку да перавыкананьня прамфінпляну, зьяўляецца давядзеньне вытворчых заданьняў да кожнага агрэгату і кожнага рабочага.

Усё-ж і на фабрыцы «Кастрычнік» ёсьць рабочыя, якія не атрымліваюць вытворчых заданьняў. Напрыклад, у закройным цэху і дэкатыровачнай. Таксама зьяўляецца недахопам, што ў зводках аб выкананьні прамфінпляну няма вестак аб колькасьці браку, перапрацоўкі і прастояў. Невыстарчальна ўлічваецца работа ўдарнікаў. Гэтыя недахопы павінны быць зьнішчаны і тады посьпехі «Кастрычніка» будуць яшчэ большымі.

Параўнаўча добра абстаіць справа на шпалернай фабрыцы. Вытворчыя заданьні даюцца кожнаму цэху і кожнай машыне на месяц. Заданьні вывешваюцца каля кожнай машыны. Не ажыцьцяўляецца гэтае мерапрыемства ў лашчыльным цэху, а таксама ў сьлясарным і рэзачным цэхах, бо гэтыя цэхі выконваюць рамонтныя работы па заказах іншых цэхаў. Таксама добра пастаўлена ўлік выпрацоўкі. Штомесячна складаюцца зводкі выпрацоўкі кожнай машыны—у кацельным, бандарольным і ўпаковачным цэхах. У зводкі ўключаецца колькасьць выпрацаванай прадукцыі, якасьць яе, процант браку і прастоі. У асноўным цэху ўстаноўлена чорная дошка, на якой кожны дзень адзначаецца нумар машыны, якая ня выконвае сваёй нормы. Дошку паставілі самі рабочыя. Апрача таго, адміністрацыя інфармуе рабочых аб выніках работы кожнага кварталу. Трэба адзначыць, што якраз гэта зьяўляецца слабым месцам, бо больш частая інфармацыя, хаця-б штомесячная, прынесла-б больш карысьці. Вынікі добрай прапрацоўкі прамфінпляну адбіваюцца на яго выкананьні: як відома, шпалерная фабрыка ўвесь час добра выконвае свой прамфінплян.

Больш-менш добра даведзен прамфінплян да варштату на гуце «Пралетары». На кожным асартымэнце прадукцыі складаецца прамфінплян, які перадаецца варштатам. Вытворчыя заданьні вывешваюцца на спэцыяльных дошках. Але па некаторых асартымэнтах не паказаны максымальны процант бою і браку. Улік работы кожнага варштату вядзецца, але былі выпадкі несвачасовага падагуленьня вынікаў работы. У апошні час гэтыя вынікі запісваюцца на кавалачках паперы, якія вывешваюцца на нипрыкметным месцы. Інфармацыя рабочых адміністрацыяй таксама праводзіцца досыць рэдка. Усё-ж, паколькі кожны варштат ведае свае заданьні, завод увесь час добра выконвае свой прамфінплян.

Прамфінплян даведзен да кожнага рабочага таксама і на фармзаводзе. Рабочыя атрымліваюць заданьні на кожны дзень і на месяц. Затое кепска на фармзаводзе абстаіць з інфармаваньнем рабочых аб выніках выкананьня прамфінпляну.

Амаль на ўсіх іншых прадпрыемствах з давядзеньнем прамфінпляну да варштату справа абстаіць значна горш. На дражтолькі да цэху. Таксама даведзен прамфінплян да варштату зусім не даведзен. На гарбарні «Бальшавік»—даведзены толькі да цэху. Таксама даведзен прамфінплян да цэху на фабрыцы «Чырвоны Тэкстыльшчык» і на шчотачнай фабрыцы. На апошняй штомесячныя заданьні даюцца толькі майстром цэху. Спроба давесьці вытворчыя заданьні да кожнага рабочага скончылася нічым, бо заданьні былі надрукаваны так неразборліва, што нават пісьменнаму іх цяжка было прачытаць.

Не даведзен прамфінплян да варштату і на заводзе «Дрэваапрацоўшчык», на заводзе «Энэргія», на заводзе «Камунар» і на радзе іншых прадпрыемстваў. І характэрна адзначыць, што там, дзе прамфінплян да варштату не даведзен, там ён сыстэматычна недавыконваецца. Гэта лішні раз сьведчыць аб тым, якое важнае значэньне ў справе выкананьня прамфінпляну мае давядзеньне прамфінпляну да варштату.

Д.

## Больш ініцыятывы і настойлівасьці

Дзеля ўчора ў ЦКК-РСІ адбылася нарада ўдзельнікаў налёту на прадпрыемствы, які быў зроблен з мэтай праверкі, ці даведзен прамфінплян да варштатаў разам з прадстаўнікамі адміністрацыі і грамадзкіх арганізацый. Былі заслуханы паведамленьні прадстаўнікоў адміністрацыі і фабзаўкомаў раду прадпрыемстваў аб становішчы гэтай справы і судаклады кіраўнікоў «лёгкай кавалерыі» аб выніках налётаў.

Паведамленьні выклікалі жывы абмен думкамі. Характэрна адзначыць, што ўдзельнікі нарады закідалі адзін другога дасяткамі пытаньняў, што гаварыла аб тым, што да гэтага часу, г. зн. да налёту, на прадпрыемствах мала хто цікавіўся давядзеньнем прамфінпляну да варштату і ва многіх адміністрацыйна - тэхнічных работнікаў ня было нават выразнага ўяўленьня, як ту работу трэба правесьці.

Налёт значна падштурхнуў прадпрыемствы на ажыцьцяўленьне гэтага важнішага мерапрыемства, якое зьяўляецца лепшай гарантыяй выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. Характэрна адзначыць, што на хлебазаводзе працуе трох дзён увесь адміністрацыйна - тэхнічны персанал працаваў нават на вечарох, каб нагнаць прапушчанае і некалькі больш наблізіць прамфінплян да кожнай брыгады. Зразумела, што ў тры дні гэту вялікую работу правесьці цяжка. Але ўжо адно гэта, што на хлебазаводзе за гэту работу ўзяліся сурёзна, дае гарантыю давядзеньня прамфінпляну да кожнай брыгады. Прыблізна такі-ж малюнак нагляднага і на радзе іншых менскіх прадпрыемстваў. У гэтым — асноўнае значэньне праведзенага налёту.

Што выявілася на нарадзе? Па-перше, тое, што нават для некаторых адміністрацыйна - тэхнічных работнікаў пытаньне аб давядзеньні прамфінпляну да варштатаў ня зусім яснае. Некаторыя зьмешвалі гэтае пытаньне з уліком выпікаў работы варштатаў і сацабарніцтва. Ім здавалася, што пытаньні яны інфармуюць рабочых аб выніках выкананьня прамфінпляну, гэтым абмяжоўваецца давядзеньне прамфінпляну да варштатаў.

Па-другое, адміністратары імкнуліся зваліць віну за невыкананьне дырэктыў аб давядзеньні прамфінпляну да варштату на розныя «аб'ектыўныя» прычыны. Дагаворваліся да таго, што ў іх ні іншым цэху нельга давесьці прамфінплян да варштату, бо ў гэтым цэху існуе разьмеркаваньне працы, у ён час, як гэта акалічнасьць значна палягчае давядзеньне прамфінпляну да варштату. Некаторыя адміністратары лічылі яту работу справай прафарганізацыі. Так зрабілі на гарбарні «Бальшавік», але адміністратары панадзеяліся на прафарганізацыю і самі да апошняга часу нічога не рабілі. А на заводзе «Энэргія» плянавы аддзел яшчэ і сёньня чакае ад прафарганізацыі нейкіх інструкцый аб давядзеньні прамфінпляну да варштату. Зразумела, прафарганізацыя павінна дапамагчы адміністрацыі ў гэтай справе, але адказнасьць за давядзеньне прамфінпляну да варштату ляжыць цалкам на адміністрацыйна-тэхнічным пэрсанале. Гэта час ужо зразумець.

Па-трэцяе, на нарадзе ноўнасьцю пацьвердзілася, што асноўнай прычынай недавядзеньня прамфінпляну да варштату зьяўляецца ў большасьці выпадкаў простая нядбайнасьць адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу. Напрыклад, на гарбарні «Бальшавік» ужо тры месяцы, як вядзецца падрыхтоўчая работа на давядзеньні прамфінпляну да варштату. Былі заказаны рамкі, потым шкло да іх, потым пачалі распрацоўваць плян і так да самага налёту. На дражджавым заводзе «Чырвоная Зара», ня гледзячы на вычарпальныя паказьні харчаб'яднаньня, прамфінплян да варштатаў не даведзен. Тое самае на шчотачнай фабрыцы, дзе заданьні даводзяцца толькі да майстроў цэхаў і г. д.

Некаторыя ўдзельнікі нарады чакалі ад яе паказаньня аб адзінай мэтадалёгіі давядзеньня прамфінпляну да варштату. Гэтага, зразумела, нарада даць не магла, бо ў гэтай справе нельга выпрацоўваць адзіных рэцэптаў аб мэтадах давядзеньня прамфінпляну да варштатаў для ўсіх прадпрыемстваў. На кожным прадпрыемстве ёсьць свае асаблівасьці. На адных заводах заданьні варштатам можна даваць штодзенныя, на другіх — 5-цідзенныя, а на трэціх — месячныя або квартальныя. На адных заводах можна наладзіць штодзенны ўлік работы, а на другіх цяжка правесьці нават месячны ўлік (там, дзе маем справу, напрыклад, з вырабам складаных машын). На кожным прадпрыемстве павінна быць праяўлена максымальная ініцыятыва і знойдзены шляхі для больш пасьпяховага давядзеньня прамфінпляну да варштату. Нарада не дала паказаньня наконт адзінай мэтадалёгіі, затое яна дала магчымасьць азнаёміцца з практыкай работы ў гэтай галіне розных прадпрыемстваў. Кожны ўдзельнік нарады мог пачэрпнуць з выступленьняў шмат карыснага для свайго прадпрыемства.

Выступленьнем супрацоўніка «Зьвязды» нарада закончылася. «Зьвязда» высунула лёзунг — «Да XVI зьезду УсеКП(б) давесьці прамфінплян да кожнага варштату». Да адкрыцьця зьезду засталося два тыдні. Тэрмін не такі ўжо вялікі для гэтай складанай работы, але, прымаючы пад увагу, што, папершае, дырэктыва аб давядзеньні прамфінпляну да варштату павінна быць выканана да 1-га чэрвеня (што большасьцю прадпрыемстваў ня зроблена), па-другое, што на многіх прадпрыемствах праведзена падрыхтоўчая работа да выкананьня гэтай дырэктывы і, патрэцяе, што налёт значна падштурхнуў і дапамог высьветліць шмат незразумелага ў гэтым пытаньні, — тэрмін зусім выстарчальны для пасьпяховага ажыцьцяўленьня дырэктывы аб давядзеньні прамфінпляну да варштату.

ДВА ТЫДНІ ДА ЗЬЕЗДУ ПАВІННЫ ПРАЙСЬЦІ Ў НАПРУЖАНАЙ РАБОЦЕ. Складна інфармаваць «Зьвязду». П.

## У атмасфэры раўнадушша

Налёт на бабруйскія прадпрыемствы прайшоў пры поўным ігнараваньні мясцовай акруговай газэты «Камуніст». Нават на просьбу інспэкцыі РСІ зьмясьціць 22-га мая заметку аб налёце, рэдакцыя гэтага не зрабіла, ня гледзячы на абяцаньне сакратара рэдакцыі. З гэтай прычыны многія начальнікі «лёгкай кавалерыі» і нават старшыні фабзаўкомаў аб налёце нічога ня ведалі. Налёт на радзе прадпрыемстваў пачаўся са спазьненьнем і таму, ня гледзячы на прапанову створаных камісіі—прадставіць вынікі налёту не пазьней 25-га мая, чыгуна-ліцейны завод, завод імя Адзарыха, сьпіртагарэлачны завод, пільні № 6 і 7, камбінаваная фабрыка і электрастанцыя да гэтага тэрміну вынікаў не прадставілі.

Вынікі налёту на Бабруйскія прадпрыемствы кажуць аб тым, што дырэктыва аб давядзеньні прамфінпляну да варштатаў выканана толькі часткова і то не на ўсіх прадпрыемствах.

На Бабруйскім камбінаце прамфінплян давядзен да кожнага варштату, за выключэньнем электрастанцыі і рамонтнага цэху. Кожны варштат ведае пра свае заданьні на месяц. Дыяграма выкананьня прамфінпляну па цэху ў цэлым і па асобных стадыях работы вывешваецца штомесячна. Але адставаньне бухгальтэрыі на 4 месяцы не дае магчымасьці своячасова мець паказальнікі сабекошту. І паколькі якраз з сабекошту на камбінаце справа абстаіць вельмі дрэнна, можна сабе ўявіць усё значэньне слабой работы бухгальтэрыі.

Прамфінпляна даведзен да кожнага рабочага і на шчацінной фабрыцы. Але гэтае мерапрыемства праведзена нядаўна, таму яно яшчэ не дапамагло ліквідаваць прарыў першага кварталу (за паўгодзьдзе праграма выканана толькі на 91,2 проц.). Тут таксама добра пастаўлен улік выкананьня прамфінпляну. Кожныя дзесяць дзён вывешваюцца зводкі. Штомесячна рабочыя інфармуюцца аб выкананьні якасных і колькасных паказальнікаў.

На фанэрным заводзе імя Томскага прамфінплян даведзен да кожнага варштату і кожнай групы рабочых. Заданьні рабочыя атрымалі да канца гаспадарчага году. Выкананьне прамфінпляну ўлічваецца падэкадна і асьвятляецца ў пасьценнай газэце. Пытаньне аб выкананьні прамфінпляну і аб давядзеньні яго да варштату абгаворвалася на вытворчай нарадзе. Усё гэта разам узятае спрыяла таму, што прамфінплян за першае паўгодзьдзе выканан на 122 проц.

На іншых прадпрыемствах — справа горшая. На мэтапязводзе імя Сталіна цьвёрдага прамфінпляну зусім няма, а той, што ёсьць, не даведзен нават да цэхаў. Уліку работы няма. Справаздачнасьць адсутнічае. Бухгальтэрыя адстае больш, чым на 5 месяцаў. На панчошна-трыкатажнай фабрыцы імя Крупскай прамфінплян даведзен да цэхаў толькі з 15 мая. Гэта зьяўляецца асноўнай прычынай, чаму фабрыка за першае паўгодзьдзе выканала вытворчую праграму толькі на 65 проц. На кардоннай фабрыцы імя Сталіна прамфінплян да машыны не даведзен. Пытаньне на вытворчай нарадзе не абгаворвалася. Аб прарывах рабочыя інфармаваліся несвачасова. На мэблявай фабрыцы імя Халтурына плян не даведзен нават да цэху. Рабочыя не мабілізуюцца на ліквідацыю прарыву, які за першае паўгодзьдзе дасягае 24 проц. вытворчай праграмы. На гуце «Камінтэрн» прамфінплян даведзен толькі да зьмен. На гуце «Кастрычнік» прамфінплян да цэхаў не даведзен. Гэта—адна з прычын, што вытворчая праграма за першае паўгодзьдзе недавыканана на 5 проц.

Вынікі налёту па Бабруйску яшчэ больш падкрэсьліваюць усё значэньне давядзеньня прамфінпляну да варштату. Адначасова налёт паказаў, што адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал многіх прадпрыемстваў гэтага недаацэньвае. Не даацэньваюць гэтага і многія грамадзкія арганізацыі, у тым ліку Бабруйскі акругком камсамолу, які зусім ня прыняў удзелу ў арганізацыі налёту.

Лёзунг, высунуты газэтай «Зьвязда» —аб давядзеньні прамфінпляну да варштату да XVI зьезду партыі—трэба актыўна падтрымаць і бабруйскім прадпрыемствам.

БАБРУЙЧАНІН.

## Пакажам партзьезду узоры калгаснай работы

# ПЕРАМОЖЦЫ

Нядаўна на старонках „Зьвязды" паведамляпася аб экскурсіі калгасьнікаў Бабруйшчыны ў калгас „Расьсьвет-Пераможца".

Сёньня мы прадрабязна высьвятляем працу гэтага калгасу. Яскравая агітацыя паказам пераваг калектыўных форм сельскай гаспадаркі і ў выніку—арганізацыя раду новых калгасаў у розных акругах БССР, буйныя посьпехі ў падвышэньні ўраджайнасьці, значнае перавыкананьне пляну сяўбы, дапамога бедняком і індывідуальнікам, прыцягненьне лепшых калгасьнікаў у партыю, буйныя дасягненьні ў культурнай працы—вось з чым прыходзяць пераможцы з „Расьсьвету-Пераможца" на XIII зьезд КП(б)Б.

Амаль 10 год прайшло з тэй пары, калі 20 батракоў былога памешчыка Шапілава арганізавалі ў зруйнаваным у Кастрычніцкія дні маёнтку невялікі калгас. Ня было інвэнтару, ня было дзе жыць ні людзям, ні жывёле. 13 коняй і 17 кароў—вось і ўся гаспадарка амаль адзінага ў той час у Жлобінскім раёне, Бабруйскае акругі калгасу.

Кулакі тэрорам і агнём імкнуліся зьнішчыць батрацкі калгас. Яны зьбіраюць калгасьнікаў, пагражаюць ім сьмерцю. А ў 1922 годзе, увосень, калі ўраджай ужо быў сабраны, раптам згарэла гумно і разам з ім усё калектыўнае збожжа.

Праз два гады—чарговы кулацкі падпал. Загінулі ўсе клявы, 21 конь, 20 кароў, буталі. Згарэла ўсё. Некалькі чалавек ня вытрымалі. У калгасе засталося толькі 16 батракоў.

### НА РУІНАХ БУДУЕЦЦА НОВАЯ ГАСПАДАРКА

Закупляюцца коні, адбудоўваюцца сыраварня, крухмальны завод. Калгасьнікі працуюць круглыя суткі. Актывістыя ночы ня сьпяць, абмяркоўваючы пляны аднаўленьня гаспадаркі.

1.000 руб. крэдыту — на гэтым не разьдзешся. І калгасьнікі максымум увагі аддаюць разьвіцьцю сваіх прадпрыемстваў. У 1926 годзе калгас дабіўся таго, што яго крухмальня і сыраварня ўжо давалі 8.000 руб. у год прыбытку. «Расьсьвет» атрымаў магчымасьць набыць рад машын трактар. У 1927 годзе да калгасу «Расьсьвет» далучаецца арцель «Утро Коммуны» у складзе 5 сем'яў. Яна прынесла з сабою 10.000 руб. запазычанасьці. Далучаецца і арцель «Хлебароб».

Летась у «Расьсьвет» улілося 80 бядняцкіх гаспадарак навуковых вёсак.

### КАЛГАС—УЗОР ДЛЯ НАВУКОЛЬНАГА СЯЛЯНСТВА

За гэты год у ім перабывала 7.000 экскурсантаў сялян.

Дзесятні новых калгасаў у розных акругах Беларусі арганізавалі экскурсанты-сяляне, пабыўшы ў калгасе «Расьсьвет-Пераможца» і пераканаўшыся ў перавагах калектыўнага земляробства. «Камвуз» Беларусі ў Менскай акрузе, «Чырвоная Ніва» і «Новае Жыцьцё» ў Бабруйшчыне, «Камінтэрн» у Гомельшчыне і рад іншых калгасаў—усё гэта вынікі агітацыі паказам «Расьсьвета-Пераможцы».

За апошнія гады калгас дабіўся выключных посьпехаў у справе павышэньня ўраджайнасьці і разьвіцьця жывёлагадоўлі. У 1926 годзе жыта намалочвалі 7 цэнтнераў з гэкт.; у 1929 годзе—13 цэнт. Замест 7 з палов. авёс стаў даваць 14 цэнт., замест 100 бульбы пачалі зьбіраць 168 цэнт. на гэктар.

«Расьсьвет-Пераможца» мае зараз 113 рабочых коняй, 326 дойных кароў, 167 цялят. Новыя буйныя каштуюць 68.000 руб. Адзін клюб абышоўся ў 17 тыс. Зьмяшчае ён больш 700 чал. У новых памяшканьнях жыве 23 сям'і. Абсталявана хлявоў на 400 штук жывёлы.

Летась калгас здаў дзяржаве: 3.000 пуд. збожжа, на 17.000 руб. масла і сыру, па 30.000 крухмалу.

У сярэднім на кожны двор, які ўваходзіць у калгас, падае 700 руб. таварнай прадукцыі.

У сёлетнюю веснавую кампанію ў калгас улілося новых 70 бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Гэта зьявілася вынікам узорнай працы ў справе правядзеньня сельска-гаспадарчай кампаніі. Калгас за кошт цаліны і адкідных зямель пашырыў на 15 проц. свой яравы клін. Сяўба была праведзена сапраўды ўдарна.

### САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА АХАПІЛА ЎСІХ КЛГАСЬНІКАЎ

Ужо спачатку сяўбы ва ўдарныя брыгады ўвайшло амаль палова членаў калгасу—207 чал. На сацспаборніцтва быў выклікан калгас «1-ае мая».

Ударнікі перавышалі вызначаныя нормы выпрацоўкі. Такія нормы, як поўгектара ворыва, адзін гэктар баранаваньня перавышаліся на 30-40 проц. У часе сяўбы калгасьнікі адмовіліся ад выхадных дзён і сьвят. У сьвята працавалі нават старыя. За першы і другі дзень вялікадня было заарана 17 гэкт. плошчы, забаранавана і засеяна аўсом 27,6 гэкт. Такі ўдарны тэмп працы дазволіў «Расьсьвету-Пераможцы» скончыць сяўбу на 4 дні раней вызначанага тэрміну, замест 20—16 мая.

Калгас узяў шэфства над другім калгасам «Кастрычнік». Апошняму была аказана дапамога як цягавай, так і людзкой сілай, насеньнем.

### РАПАРТ XIII ЗЬЕЗДУ

Вось што пішуць калгасьнікі «Расьсьвета-Пераможцы» ў сваім баявым рапарце XIII зьезду КП(б)Б:

«Пасьля скончэньня сяўбы ўсе сілы былі кінуты на дапамогу бедняком і маламоцным серадняком. Два дні працавалі трактарамі, далі 100 конных дзён, 56 чалавека-дзён. Дзякуючы дапамозе калгасьнікаў усе вёскі Майскага сельсавету скончылі сяўбу. У калгасе засеяна: 235 гэкт. жыта, 137 гэкт. аўсу, 135 гэкт. бульбы, 24 гэкт. ячменю, 9 гэкт. пшаніцы, 23 гэкт. ільну, 6 гэкт. кукурузы і кораньплодаў, паўтара гэкт слонечніку, 141 гэкт. грэчкі, 63 гэкт. вікі, 44 гэкт. капюшны, 30 гэкт. агародных культур, 1 гэкт. махоркі. Засаджана 15 гэкт. новага саду са свайго рассадніка.

Дзякуючы сьвядомым адносінам да працы і карыстаньню радковымі сяўркамі калгас зэканоміў 2.100 пуд. насеньня.

Гаспадарка калгасу расьце і мацнее з кожным днём. Яго тэрыторыя за апошні час амаль падвоілася. Зараз калгас займае плошчу ў 1.246 гэкт., з якіх: 805 ворнай зямлі, 37—саду, 182—сенажацяй, 231—выпасаў. Ёсьць два трактары, 6 сяпярак, 4 жнявяркі, 4 трыеры, 3 складаныя малатарні, 52 плугі. Акрамя коняй і кароў, ёсьць 41 пародзістая сьвіньня, 2 кныры.

Уся маемасьць, апрача птушак і часткі сьвіней, у калгасе абагулена. Характэрна, што калі праўленьне прапанавала вярнуць калгасьнікам па карове, усе калгасьнікі адмовіліся.

### ПАЧАТА ПАДРЫХТОЎКА ДА ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ

Вялікую ролю ў калгасе адыгрываюць вытворчыя камісіі, на якіх прысутнічаюць амаль усе калгасьнікі. На апошнім пасяджэньні камісіі — 27-га мая вельмі актыўна абмяркоўваліся пытаньні падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю і падняцьця папару пад жыта. Пачаўся рамонт с.-г. машын, калёс, будуецца вялікае гумно, падрыхтоўваецца рабочая цягавая сіла. Ва ўдарныя брыгады па ўборцы ўраджаю запісалася 213 чал., сярод якіх 58 жанчын.

Добра працуюць у калгасе брыгады будаўнікоў і па абслугоўваньні жывёлы. У выніку ўдарніцтва і сацспаборніцтва на крухмальні павялічылася прадукцыйнасьць працы на 37 проц. Раней у дзень пераапрацоўвалася 3½ цэнт. бульбы, зараз—46 цэнтн.

Лепшыя калгасьнікі-актывістыя вылучаюцца на пастаянную работу ў акругу, раён і нават у цэнтр. Адзін з калгасьнікаў зьяўляецца членам ЦВК СССР. Толькі за мінулы год на адказную працу вылучана 6 чал.

### ВЯЛІКАЯ ДАПАМОГА БЕДНАЦЕ

Калгас «Расьсьвет-Пераможца» аказвае вялізарную дапамогу беднаце навукольных вёсак. Апрача дапамогі пры сяўбе, беднаце безваротна адпушчана 53 цэнт. аўсу, сотні пудоў хлеба і інш. Ужо пасьля скончэньня веснавой сяўбы ў калгас улілося 17 бядняцка-батрацкіх гаспадарак.

### ШКОЛА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Пры калгасе «Расьсьвет-Пераможца» ёсьць школа сяміголка. На пастаноўцы працы яна зьяўляецца ўзорам для ўсёй Бабруйшчыны. Школа ставіць сабе галоўнай мэтай—укараніць калектывізм у асяродзішча вучняў. На былым школьным вучастку летась арганізаваўся вучнёўскі калектыў, у які ўступіла 115 вучняў—50 проц. складу школы. Уся с.-г. плошча школы добра ўтоена. У школьных парнікох вырашчана шмат рассады: тры гэктары памідораў, 5 гэкт. капусты, 2 гэкт. гуркоў. 55 проц. рассады перадана калгасу і індывідуальным гаспадаркам; рэшту засадзілі самі.

Сямігодка выпускае тры газэты: «Школьнае Жыцьцё», «Прамень Культуры» і «Малады Калгасьнік», якія рэгулярна выходзяць. Вучні прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх важнейшых гаспадарчых і палітычных кампаніях. Імі сабрана 110 цэнт. поплаву, 20 цэнт. утылю. Старэйшыя дзьве групы былі скарыстаны для растлумачэньня артыкулаў т. Сталіна «Адказы таварышам-калгасьнікам». Вучні хадзілі па хатах і зачытвалі гэты артыкул. Школу наведваюць дзесяткі экскурсій, дзе яны на справе бачаць, як выхоўваюцца новыя людзі-калектывісты.

### ЛЕПШЫЯ КАЛГАСЬНІКІ — У РАДЫ ПАРТЫІ

Сваім шпаркім разьвіцьцём калгас абавязан правільнай рабоце партыйнай ячэйкі і кіраўніцтву калгасу. Добра працуе і батрацка-бядняцкая група, праз якую мабілізуецца вытворчая і палітычная актыўнасьць калгасьнікаў.

Лепшыя калгасьнікі групамі ўступаюць у рады камуністычнай партыі. На апошнім пасяджэньні парт'ячэйкі абмяркоўвалася 10 заяў калгасьнікаў аб прыёме іх у рады партыі. Сярод 6 прынятых—былыя батракі, беднякі-ўдарнікі—прыкладныя калгасьнікі. Прыняты таксама 1 серадняк, на якім раўняюцца ўсе калгасьнікі і які зьяўляецца арганізатарам калектыву.

Майская парт'ячэйка абрастае моцным актывам, які яна выхавала ў жорсткай барацьбе з клясавым ворагам.

Добра працуе і камсамольская ячэйка. 50 камсамольцаў першымі абвясьцілі сябе ўдарнікамі. Яны працуюць і на крухмальні, і на сыраварні, і на палёх —і ўсюды яны зьяўляюцца прыкладам для ўсёй калгаснай масы.

### АПОШНІЯ ПОСЬПЕХІ

У калгасе 83 дэлегаткі—палова з іх ударніцы.

У «Расьсьвеце-Пераможцы» больш чым 300 чал. лічацца ў актыве.

У піянэратрадзе калгасу налічваецца 30 дзяцей.

Існуюць яслі на 100 дзяцей.

Арганізавана сталоўка на 100 чал., 33 пажылыя калгасьнікі і калгасьніцы нядаўна ліквідавалі сваю няпісьменнасьць, скончана набудовай сілаская вежа на 30 пуд. сілясу. 70 асоб толькі нядаўна выпусьціла вячэрняя школа, устаноўлена радыё і кіно—вось самыя апошнія посьпехі калгасу.

Е. САЛДАЦЕНКА.

На здымку: нядаўна пабудаваны вялізны клюб у калгасе «Расьсьвет» — Пераможца.

На здымку: экскурсія вучняў Старобінскага раёну ў саўгасе імя 10-годзьдзя БССР на Мар'іне

# Завоз уборачных машын ідзе вельмі павольна

## Ні аднаго сярпа, ні аднае касы. 500.000 рублёў дарэмна патрачаны на нягодныя вазы

## Пасьпяхова скончым сяўбу. Даб'ёмся зруху ў падрыхтоўцы бальшавіцкай уборачнай кампаніі

Своячасовая падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі зьяўляецца аднэй з галоўнейшых задач сёньняшняга дня, ад выкананьня якой залежыць забесьпячэньне краю і выкананьне пяцігадовага пляну прамысловасьці.

Важнейшую ролю ў пасьпяховым выкананьні ўборачнай кампаніі павінна адыграць своячасовае забесьпячэньне калгасаў, саўгасаў і асобных сялян необходнымі новымі ўборачнымі машынамі і поўная мабілізацыя ўсіх сродкаў вытворчасьці, якія могуць быць скарыстаны для ўборкі і апрацоўкі ўраджаю.

Паглядзім як нашы арганізацыі рыхтуюцца да гэтай важнейшай справы?

Завоз машын да ўборачнай кампаніі праходзіць вельмі дрэнна. Ёсьць сур'ёзная небясьпека, што плян завозу пры такіх тэмпах работы «Белсельхозснаба» своячасова ня будзе выкананы.

Замест 1.040 касарак, якія вызначаны да завозу паводле пляну, на сёньнешні дзень завезена толькі 700. З 2.730 жнявярак завезена 1.700. Катастрафічнае становішча з снопавязалкамі—ні адна на сёньнешні дзень не завезена.

Наколькі дрэнна праходзіць забесьпячэньне машынамі відаць з таго, што нават такімі «складанымі» машынамі, як косы, «Белсельхозснаб» змог забясьпечыць БССР толькі на 56 проц. Сярпоў, паводле вестак «Белсельхозснаба», яшчэ не завезена ні аднэй штукі.

Яшчэ горш стаіць справа з арганізацыяй рамонтных майстэрань із рамонтам машын. Дробныя рамонтныя майстэрні зусім не забясьпечаны необходным абсталяваньнем і інструмантам.

Зусім дрэнна стаіць справа з правільным выкарыстаньнем тарктараў, з забесьпячэньнем іх запаснымі часьцямі. Абслугоўваючы пэрсанал вельмі нізкай кваліфікацыі, з прычыны чаго мы наглядаем частыя паломкі часьцей і трактараў.

Кепска таксама стаіць справа з забесьпячэньнем сялян звычайнымі вазамі, якіх было заказана звыш чым на 500.000 руб. Вазы «Белсельхозснабам» былі заказаны на заводзе імя Пятроўскага ў Хэрсоне і зусім не прыстасаваны да беларускіх дарог. Обад каляса вельмі малы (1¾ дзюйма) і зусім не падыходзіць да нашых дарог. Акрамя гэтага вазы вельмі цяжкія і нашы коні ледзь іх могуць падягнуць. Вазы стаяць на складах і ня купляюцца сялянствам.

«Белсельхозснабу» неабходна зараз-жа прыняць тэрміновыя меры. На заводы, якія выраблялюць уборачныя машыны, павінны быць пасланы спэцыяльныя прадстаўнікі, якія-б сачылі за своячасовым выкананьнем пляну адгрузкі уборачных машын. Інакш можа паўтарыцца леташняя гісторыя, калі трыеры прыбылі пасьля правядзеньня ачысткі (яны яшчэ зараз стаяць на складах нескарыстанымі). скончана. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на арганізацыю рамонтных майстэрань і забесьпячэньне іх патрэбным жалезам і інструмантамі.

А.

# Аб адводзе сенажаці калгасам і індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам

## Пастанова СНК БССР)

У мэтах своячасовага адводу сенажаці калгасам і індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Адвод сенажаці павінен вытварацца спрошчаным мэтадам, шляхам зямляпаказаньняў. Адводы сенажаці вытвараюцца сіламі зямляўпарадчыка, а нескладаныя адводы—сіламі сельсаветаў.

У патрэбных выпадках зямельныя органы павінны аказваць сельсаветам і насельніцтву тэхнічную і іншую дапамогу ў разьмеркаваньні сенажаці паміж індывідуальнымі бядняцка-серадняцкімі дварамі, захоўваючы пры гэтым клясавы прынцып.

2. Разам з адводам сенажацяй калгасам павінны адначасова адводзіцца сенажаці і індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам. Адвод сенажацяй індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам праводзіцца паводле фактычнага зямляўпарадкаваньня, якое вызначаецца зямельнымі плянамі, зямельнымі запісамі, зямельнымі лістамі па с.-г. падатку і іншымі дакумантамі.

3. Захоўваючы пры адводзе сенажаці прынцып адводу калектыўным гаспадаркам лепшых зямель, імкнучыся, каб калгасам адводзіліся сенажаці ў адным-двух масывах, у той-жа час не дапушчаць, каб індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам адводзіліся адны толькі малаўраджаныя вучасткі.

Калектыўным гаспадаркам, арганізаваным у раёнах хутарскога зямлякарыстаньня і на тэрыторыі дробных пасёлкаў, сенажаці (асабліва сухадольныя) могуць адводзіцца і ў большым ліку вучасткаў, калі гэта будзе неабходна па мясцовых і тэхнічных умовах.

4. Сенажатныя вучасткі, якія адводзяцца калгасам і індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, павінны быць абавязкова забясьпечаны праездамі і прагонамі для магчымасьці скарыстаньня гэтых плошчаў пасьля скосу для пасьбы жывёлы.

5. Плошча сенажацяй, якія належалі кулацкім гаспадаркам, за выключэньнем тае мінімальная часткі, якая пакінута ім у карыстаньне, па пастановах акруговых і раённых выканаўчых камітэтаў павінна перадавацца калгасам і саўгасам.

6. У тых раёнах, дзе яшчэ ня скончаны адвод папарнага кліну для калгасаў і індывідуальных гаспадарак—разам з адводам папарнага поля, адначасна рабіць і адвод сенажаці.

7. Пры адводзе сенажаці індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, межы сенажатых вучасткаў паказваюцца ім у натуры, у прысутнасьці ўпаўнаважаных ад вёскі і прадстаўнікоў ад сельскага савету, прычым групам гэтых гаспадарак павінны быць перададзены сьпісы з паказаньнем, якая плошча адводзіцца кожнай гаспадарцы.

8. Разьмеркаваньне па разьвіцьцё сенажацяй калгасам і індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам павінен быць паведамлены ім у натуры, у прысутнасьці ўпаўнаважаных ад вёскі і прадстаўнікоў ад сельскага савету, прычым групам гэтых гаспадарак павінны быць перададзены сьпісы з паказаньнем, якая плошча адводз

# Арганізуем на прадпрыемствах штабы па барацьбе са стратамі

На неабходнасьць барацьбы са стратамі на прадпрыемствах ня раз звярталася ўвага з боку СНК і ВСНГ БССР. Старшыня ВСНГ БССР яшчэ 1-га сакавіка зьвярнуўся з заклікам да рабочых, грамадзкіх арганізацый і адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу на прадпрыемствах аб барацьбе са стратамі. Аднак, прыходзіцца канстатаваць, што ў гэтым напрамку нічога ня зроблена, а ў галіне якасьці прадукцыі наглядаецца нават і пагоршаньне.

Аб'яднаньні і прадпрыемствы да апошняга часу не разгарнулі работы па паляпшэньні якасьці прадукцыі і барацьбе са стратамі на прадпрыемствах. Многія аб'яднаньні ўсклалі столькі розных абавязкаў на рацыяналізатараў, што апошнія і зусім не займаюцца рацыяналізатарскай работай. У аб'яднаньнях ёсьць вызваленыя ад усякай іншай работы рацыяналізатары, але апошнія ўсё-ж займаюцца ўсякай дробнай перапіскай, што маглі-б рабіць супрацоўнікі са значна меншай кваліфікацыяй і з меншым акладам пэнсіі. Таксама кепска скарыстоўваюцца рацыяналізатары і на прадпрыемствах, і ў выніку гэтага шмат важных пытаньняў на барацьбе са стратамі застаюцца нявырашанымі.

Каб дабіцца пералому ў гэтай рабоце і дасягнуць рэзкага павялічэньня тэмпаў барацьбы са стратамі на прадпрыемствах, прэзыдыум ВСНГ БССР вылучыў спэцыяльную пастаянную камісію. На камісію ўскладзена задача — паставіць на ногі ня толькі гаспадарчыя, але і прафэсыянальныя арганізацыі і ўцягнуць у гэту работу шырокія рабочыя масы.

Скліканая гэтай камісіяй (28 мая) нарада кіраўнікоў гаспадарчых аб'яднаньняў і рацыяналізатараў разам з курсантамі рацыяналізатарскіх курсаў прыняла плян работы па барацьбе са стратамі. Паводле гэтага пляну, на кожным прадпрыемстве арганізуецца штаб з 5-7 асоб, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі парт'ячэйкі, фабкому, інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу, а таксама прадстаўнікі ад цэхавай ячэйкі садзейнасьці барацьбе са стратамі. Выбраныя асобы вызваляюцца ад усялякай грамадзкай нагрузкі і ўсю сваю ўвагу павінны канцэнтраваць на справе вывучэньня ўсіх пытаньняў, зьвязаных з барацьбой са стратамі.

Праграма работы па барацьбе са стратамі ў вытворчасьці вельмі шырокая і ахапляе наступныя галіны: рацыянальнае скарыстаньне сырцу, апалу і матар'ялу, мэтады скарыстаньня адкідаў, рацыянальнае скарыстаньне абсталяваньня, рабочай сілы і рабочага часу, рацыяналізацыю ўнутры - заводзкага транспарту, правільную мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў, павышэньне якасьці прадукцыі, сапраўднае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і скарыстаньне яго ў галіне барацьбы са стратамі.

Штабы арганізуюць зьбіраньне ва ўсіх цэхах прапаноў рабочых, дзеля чаго ўстанаўляюцца скрынкі ва ўсіх цэхах. Штаб павінен разглядаць усе прапановы і скаргі на розныя непарадкі не пазьней 3-х дзён пасьля іх паступленьня. Штаб няўхільна сочыць за тым, каб за ўсе прынятыя рацыяналізатарскія прапановы рабочым неадкладна выдаваліся прэміі. Ва ўсіх цэхах, клюбах, сталоўках бывешваюцца плякаты, заклікаючыя рабочых да актыўнага ўдзелу ў рабоце па выяўленьні страт і барацьбе з імі. Па прадстаўленьні штабу найбольш актыўныя рабочыя па барацьбе са стратамі вылучаюцца кандыдатамі для камандыровак на лепшыя прадпрыемствы Саюзу з мэтай павышэньня сваіх ведаў.

Але ў гэтай важнай галіне мы зможам дабіцца эфэктыўных вынікаў толькі тады, калі барацьба са стратамі будзе зьяўляцца справай усяго калектыву рабочых прадпрыемстваў, толькі пры актыўным удзеле ўсёй грамадзкасьці. Камісія ВСНГ заклікае ўсіх рабочых і работнікаў прадпрыемстваў перабудаваць усю работу пад лёзунгамі «Усе на барацьбу са стратамі», «страты —наш гаспадарчы вораг».

**Старшыня камісіі РУСАНОВІЧ.**

На здымку павільёны выстаўкі: зьверху зьлева направа. 1) Павільён рэспубліканскай прамысловасьці, 2) Павільён Лесбелу, 3) Павільён мэханізацыі с.-г. Унізе зьлева направа 4) Павільён лясной гаспадаркі 5) Павільён земляробства

# Забясьпечыць сваячасовае адкрыцьцё выстаўкі

Думаецца, што нават тыя гаспадарчыя, прафсаюзныя і інш. работнікі, якія дагэтуль глядзелі на справу будаваньня выстаўкі, як на нешта такое, што ўрываецца ў іх нармальны распарадак работы і парушае іх спакой, што нават яны, нарэшце, вразумелі ўсё значэньне надыходзячага адкрыцьця ўсесаюзнай выстаўкі, якая заклікана падвесьці вынікі ўсёй гаспадарчай творчай работы нашай рэспублікі.

Як-жа справа з пабудовай выстаўкі? Мы ўважліва аглядалі тэрыторыю выстаўкі, якая ў асноўным займае каля 75 гэкт. плошчы. На гэтай вялізнай тэрыторыі яшчэ шмат работы. Трэба пабудаваць шляхі, разьбіць газоны і цьвятнікі, пабудаваць лаўкі для адпачынку, арганізаваць харчаваньне для шматлікіх наведвальнікаў выстаўкі.

Між тым, на тэрыторыі выстаўкі, якая патрабуе ўкладаньня яшчэ вялізнай працы, карпаецца на першы выгляд некалькі дзесяткаў чалавек. Магчыма, што людзей там больш, але на тэй вялікай плошчы, якую займае выстаўка, гэта колькасьць рабочых на пабудове выстаўкі вельмі мізэрная. Тут патрэбны многія сотні людзей, каб да тэрміну падрыхтаваць усё патрэбнае па знадворным афармленьні самое тэрыторыі выстаўкі.

Зараз пяройдзем да павільёнаў — як праходзіць іх будаўніцтва? Цэлы рад значных павільёнаў, у тым ліку і буйны павільён рэспубліканскай прамысловасьці, будуць гатовы, па заяве Белдзяржбуду, толькі да 10 чэрвеня. З гэтага боку ёсьць пэўная пагроза зрыву добра падрыхтаванага мантыраваньня экспанатаў і нават сваячасовага адкрыцьця самой выстаўкі.

Мантаж экспанатаў, як аб гэтым сьведчаць асобы, блізка знаёмыя з усесаюзнай выстаўкай 1923 году, навінен заняць часу ад 2 да 3 месяцаў. Калі будаўніцтва павільёнаў запаздоўжа, чаго трэба чакаць, дык часу застанецца мала, і мантаж будзе скамечаны, што адаб'ецца на якасным баку паказу экспанатаў. Ад гэтай пасьпешнасьці, зьвязанай з недахватам часу, можа таксама пацярпець мастацкі бок, які займае на выстаўцы не апошняе месца.

Тут мы падыйшлі да пытаньня, на якім трэба спыніцца. Ужо ня раз адзначалася, што знадворны выгляд многіх павільёнаў вельмі далёкі ад мастацкага. Гэта сумны факт, з якім так ці інакш прыходзіцца лічыцца. І перад намі зараз стаіць даволі цяжкая задача —нейкім чынам гэту няпрывабную знадворнасьць некаторых павільёнаў выправіць, затушаваць, нечым дапоўніць іх бедную архітэктуру.

Некаторымі адзьдзелами выстаўкі гэта і робіцца. Як прыклад, можна прывесьці павільён мэханізацыі і электрыфікацыі сельскае гаспадаркі, які пад рукамі майстроў - мастакоў пачынае набываць зусім іншы выгляд. Але вось павільёны сельскае гаспадаркі, аграмадзкага сэктару, лясны і інш. Што з імі будзе? Няўжо-ж яны застануцца ў іх цяперашнім непрывабным выглядзе? Чаму аб гэтым ня думае мастацкі савет выстаўкі? Няўжо ўся работа савету заключаецца толькі ў пераглядзе дыяграм і макетаў? Думаецца, што не. Агульнае ўражаньне ад выгляду самой тэрыторыі і павільёнаў выстаўкі навінна перш за ўсё прыцягнуць увагу мастацкага савету выстаўкі. Аб гэтым, пакуль ня позна, трэба ня толькі думаць, але і прыняць меры.

Наўкола мастацкага афармленьня павільёну выстаўкі і экспанатаў стварылася нездаровая атмасфэра празьмернага павышэньня цэн мастакамі, якія працуюць для выстаўкі. Прычым гэтае павышэньне цэн часамі даходзіць да простага рвацтва і, на жаль, це прайшло міма і маладых, пачынаючых работнікаў. Саюзу працаўнікоў мастацтва трэба зьвярнуць увагу на гэтае зьявішча і некалькі ўрэзаць апэтыты сваіх членаў.

Мы тут завастрылі ўвагу на некалькіх момантах, зьвязаных з будаўніцтвам выстаўкі з тым, каб на працягу часу, што застаўся да выстаўкі (2 з палов. месяцы), адпачаныя недахопы, хібы і непарадкі былі зжыты, ліквідаваны, каб забясьпечыць сваячасовае адкрыцьцё выстаўкі, добра падрыхтаванай і мастацкі афармленай.

**ЗОДЧЫ.**

# Водгукі на заметкі

### ШКОЛА БУДЗЕ ПЕРАВЕДЗЕНА

Заметка **Пакрыўджанага** «Цакута дзяцей» пасылалася на расьсьледваньне ў **Чэрвеньскі РВК.** Апошні паведаміў, што прэзыдыум РВК пастанавіў школу пераведсьці назад у старое памяшканьне таму, што памяшканьне больніцы, куды была пераведзена школа, не прыстасавана да запяткаў.

### СТЫПЭНДЫІ ВЫСЛАНЫ

У «Зьвязьдзе» № 86 у допісе «Калі будуць стыпэндыі» пісалася, што закантрактаваныя студэнты Віцебскага вэтэрынарнага інстытуту не атрымліваюць стыпэндый.

Белсельтрэст на допіс дае наступнае тлумачэньне: «Стыпэндыі за студзень месяц высланы 18 студзеня, за люты—1 сакавіка, а за сакавік і красавік—25 красавіка. Несваячасова высланы грошы за сакавік таму, што студэнты разьехаліся на практыку і не паведамілі адрасоў».

### ЗА ЗЬБІЦЬЦЁ АКТЫВІСТКІ — ДА АДКАЗНАСЬЦІ

У студзені месяцы гэтага году кулак **Палячэнка** з вёскі Воснава, **Вушацкага** раёну, зьбіў актывістку-бяднячку **Навіцкую.** Аб гэтым сваячасова пісалася ў «Зьвязьдзе» № 61. Па гэтай справе зроблена расьсьледваньне Вушацкай райміліцыяй. Апошняя паведаміла, што кулак Палячэнка арыштаваны, а разам з ім арыштаваны і Лямеша Н., як падбухторшчык.

### ХАРЛАНЧУК НЕ ВІНАВАТЫ

Пры раскулачваньні ў **Капатківцкім** раёне, як пісалася ў № 63 «Зьвязды», кулацкая маемасьць разьбіралася. У заметцы паведамлялася, што заг. зямельнай часткай РВК Харланчук узяў два кажухі. Праведзеным сьледзтвам паказаныя факты адносна Харланчука не адпавядаюць сапраўднасьці.

### ЗЛАЧЫНЦЫ БУДУЦЬ ПАКАРАНЫ

У **Стрыгалаўскай** краўецкай арцелі (Мазырыччына) рабіліся злачынствы. Цэны за заказы браліся вышэй устаноўленых. Група сваіх людзей дзяліла «прыработак» паміж сабою. Супроць гэтых злачынных учынкаў выступаў Курцэр. Апошні аб гэтым паведаміў сэкцыю РСІ пры Пятрыкоўскім РВК. Старшыня раённай сэкцыі РСІ злачынства ў арцелі не знайшоў, а наадварот абвінавачыў Курцэра. У выніку чаго ён быў зьнят з работы.

Паводле заметкі «За сьмелую крытыку—вон з арцелі» зроблена расьсьледваньне. Факты злачынства і заціску самакрытыкі ў асноўным пацьвердзіліся. Курцэру дана магчымасьць працаваць у іншых арцелях згодна яго жаданьня.

Былому складу Пятрыкоўскай сэкцыі РСІ за няправільнае вырашэньне справы па скарзе Курцэра Мазырская РСІ вынесла вымову.

Матар'ял аб злоўжываньнях кіраўніка арцелі перададны міліцыі для правядзеньня дазнаньня.

# Хроніка выстаўкі

**Дырэкцыя выстаўкі лічыць магчымым адкрыць выстаўку 11-га ліпеня—у дзень 10-цігодзьдзя вызваленьня Беларусі ад белапалякаў—замест раней вызначанага тэрміну 10-га жніўня.**

***

**Дырэкцыя выстаўкі ўзбудзіла пытаньне перад гарсаветам аб адкрыцьці на час пабудовы трамваю да выстаўкі аўтабуснага руху паміж выстаўкай і горадам, спэцыяльна для абслугоўваньня рабочых, што працуюць на выстаўцы.**

***

**Са Шаэцыі і Нямеччыны на выстаўку прыбыла абсталяваньне для мэханічнага скотнага двара.**

***

**У хуткім часе з Масквы для выстаўкі прыбываюць дзьве сілосныя вежы. На тэрыторыі выстаўкі прыступлена да пабудовы фундаманту пад гэтыя вежы.**

***

**На тэрыторыі выстаўкі заканчваецца работа па превядзеньні сяўбы на дасьледчых палёх.**

***

**Закончаны пабудовай і падрыхтаваны да прыёмкі экспанатаў мэліярацыйны, лясны, зямляробчы, масавы і лесбелаўскі павільёны.**

***

**У сувязі са зьмяншэньнем тэрміну пабудовы выстаўкі колькасьць існуючых 50 мастакоў будзе недастатковай для мастацкага афармленьня выстаўкі. З гэтае прычыны дырэкцыя выстаўкі пастанавіла выпісаць з Масквы яшчэ 30 мастакоў для хутчэйшага скончэньня работы.**

***

**Менкамгас прыступіў да пракладкі трамвайнай лініі ад Камароўкі да тэрыторыі выстаўкі.**

***

**Электрычнае асьвятленьне выстаўкі будзе скончана Эльводам 20 чэрвеня.**

# ЗА ДЗЕНЬ

— 2-га чэрвеня пры НКА адбудзецца мэтадалёгічная нарада старшынь акруговых мэтадкомаў і інспэктароў сацвыху. На нарадзе будуць стаяць пытаньні аб становішчы народнае асьветы ў БССР, паводле ўстановак 2-й усесаюзнай партнарады па нарасьвеце. Апрача таго будуць разгледжаны праграмы ФЗС, ШСМ і інш.

— Белдзяржкіно прыступіла да падрыхтоўчай работы на здымцы двух новых культурфільмаў «Жанчына»—пад кіраўніцтвам рэжысэра Штэрцэра і «Наша Зьмена»—пад кіраўніцтвам рэжысэра Карпава. Абодвы культфільмы будуць скончаны ў гэтым годзе.

— З чэрвеня месяца МЦРК уводзіць новы парадак водпуску прадуктаў для некаторых груп пайшчыкаў. Так, пайшчыкі ЦРК іншых гарадоў, што прыехалі ў Менск ня менш як на два тыдні, будуць атрымліваць у стале пайшчыкаў часовыя прадуктовыя карткі.

# СЕЛЬКОРЫ АБ РАБОЦЕ КАЛГАСАЎ

## Арганізуем працу ў калгасах, ачысьціўшыся ад шкодных элемэнтаў

### ПАПЯРОВЫЯ КАЛГАСЬНІКІ

У вёсцы **Азяраны,** Тураўскага раёну (Мазырыччына) ёсьць калгас з 8 чалавек. Некаторыя члены гэтага калгасу адмовіліся абагуліць коняй. Калгас увесь час працуе толькі кулацкімі коньмі, а іх коні гуляюць, нічога ня робяць. У выніку калгасьнікі яшчэ не пасадзілі нават бульбы. Старшыня калгасу **Х. Людзеевенец** і намесьнік старшыні **З. Клімовіч** сваю ямлю засеялі асобна. Ёсьць выпадкі, што кулацкі інвэнтар калгасьнікі паразьбіралі па сваіх гаспадарках, а не абагулілі.

Калгасьніца **М. Балбуцкая,** будучы ў калгасе, прадала ўсе свае авечкі, якія мела, а раней перад уступленьнем у калгас прадала сваю карову і цялушку.

РВК зьвярні ўвагу.

**Ведаючы.**

### ТРЭБА АЗДАРАВІЦЬ КАЛГАС

У калгасе **«Памяць Леніна»** (Самахвалавіцкі раён) дрэнна пастаўлена арганізацыя работы. На работу выходзяць толькі мужчыны, а пра жанчын няма чаго і гаварыць, яны сядзяць дома з дзецьмі. Заможнік **Кантончык,** які зьяўляецца членам калгасу, сваёй дачкі на работу зусім ня пускае. У выніку адбываюцца спрэчкі паміж калгасьнікамі.

У часе сяўбы некаторыя калгасьнікі кідалі работу і ехалі на Украіну, каб там адшукаць якую-небудзь работу, што зьяўляецца ненармальным.

Пры абагульненьні насеннай бульбы дапушчана буйная памылка. Так, той, хто мае 12 дзесяцін, даў 12 пудоў, хто мае 6 дзесяцін — даў 70 пудоў і г. д. Такім парадкам насеннай бульбы не хапіла. Калгас прымушан быў браць насенную бульбу ў крэдыт у саўгасе «Самуэлева», а некаторыя калгасьнікі зараз прадаюць сваю бульбу.

Пры ўступленьні ў калгас некаторыя заможнікі пазраздавалі коняй і кароў. Ёсьць і такія ў калгасе, як **Кізіла** Сьцяпан, які карыстаўся чужой працай, гандляваў са сваім сынам коньмі. Уступаючы ў калгас, Кізіла не паклапаціўся вывезьці з балота сена, якога там знаходзіцца каля 400 пудоў. Калгаскія коні засталіся бяз корму, а сена гніе на балоце.

Усімі гэтымі недарэчнасьцямі беднота абурана і некаторыя з іх пачалі нават выпісвацца з калгасу.

РВК неабходна зараз-жа паклапаціцца аб аздараўленьні калгасу.

**К. і Б.**

— **Абвешчана суровая** вымова з апошнім папярэджаньнем па партыйнай лініі і **зьняты з работы** старшыня Жыткавіцкага райгрупкому саюзу саўгандальслужачых **Гулечка** за п'янства і прыняцьце на работу дачкі дзяка і пастаўлена пытаньне аб яе далейшай працы.

— Пам. майстра ф-кі імя «К. Маркса» (Высачаны) **Чарнецкі зьняты з работы** за розныя злоўжываньні і шкурніцтва.

— Справа аб шкодніцтве ў абуткоцэх арцелі «Аб'яднаньне» (Нараўлянскі раён) перадана сьледчым органам для прыцягненьня віноватых да адказнасьці.

— **Зьнят з работы ў Пашноўскім** сельсавеце (Магілеўшчына) былы спэкулянт і ўласьнік млыноў **Ёселеў.**

# К. МАНГУС

## ПАМЯЦІ ТАВАРЫША

Бязьлітасная сьмерць заўчасна рвала з радоў ленінскай партыі стага загартаванага бальшавіка, стойкага рэвалюцыянэра, баявога і адданага сына рабочай клясы чэкістага т. Манг

Тав. Мангус стары адказны чэкіст з уласьцівай яму пралетарскай чулацю, штодзенна, не шкадуючы сваіх і здароўя, навучаў, выхоўваў і загартоўваў свой калектыў.

Стойкая чэкісцкая работа, аддана справе рэвалюцыі, сьмелая суровая рацьба з клясавым ворагам, настойлівасьць тав. Мангуса паслужылі прыкладам калектыву Аршанскага аддзелу АДПУ.

Клясавая лінія, якая праводзілася тав. Мангусам, і цяжкая чэкісцкая работа будзе не аслаблена, а яшчэ больш узмоцніць нашу пільнасьць і навісьць да абнаглелага клясавага ворага.

Сьпі, дарагі таварыш і кіраўнік.

КАЛЕКТЫЎ СУПРАЦОЎНІКАЎ АРШАНСКАГА АКРАДДЗЕЛУ ДП

# ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

### СЕНЬНЯ

А 7 гадз. увеч. у мэтадкоме Н (Пляц Волі, 3-ці паверх) скліканая шырокая нарада па абгаварэньні пр га праекту беларускага правапісу.

На нараду запрашаюцца пісьменьнікі і навуковыя працаўнікі.

**Клюб камунальнікаў** (Няміга,8.). Сп партыйцаў і камсамольцаў, якія жы вуць у дамах ЖАКТу №7. Пач. у гадз.

**Дом асьветы.** ЦП саюзу працаўнікаў закупіла для членаў саюзу спэктакл памяшканьні летняга тэатру «Прафтэрн» **на 5 чэрвеня** «Чалавек з партбілем» і опэру **на 3 чэрвеня** у памяшканні Дзяржтэатру «Аида». Білеты ў кас Дому з 12-14 і з 18-22 г.

### ЗАЎТРА

**Рэспубліканскае Бюро АРУ.** А 8 га увеч. у памяшканьні АРУ (Савецкая 65) адбудзецца сход актыву гандлёвых каапэрац. сэктару АРУ, а 9 гадз. ув у памяшканьні Аргбуду (Савецкая, адбудзецца сход актыву сэктару кадраў АРУ. Запрашаецца актыў АРУ.

### ДА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ, ПІЯНЭРАЎ, ШКОЛЬНІКАЎ ГОР. МЕНСКУ

У падарунак XIII зьезду КП(б)Б піянэры і школьнікі Беларусі арганізуюць адзіны дзень збору ўтыльсырцу на 2-ю чэрвеня на карысьць трактарнае калоны.

Піянэры і школьнікі гор. Менску! У на збор утыльсырцу 2-га чэрвеня па кіраўніцтвам важатых фармастоў і сп гадчыкаў школ.

Працоўныя ўсяго гораду Менску зда вайце ўтыльсырцу!

**Мен. Акр. Бюро Дз. Кам. арганізацыі.**

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

**Пракуратура Рэспублікі выказвае глыбокі жаль з прычыны нечаканай раптоўнай сьмерці старога бальшавіка-чэкістага**

**тав. МАНГУСА**


ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ

**І. В. СТАЛІН.—Зборнік артыкулаў да пяцідзесяцігодзьдзя з дня нараджэньня.**

Стар. 164. Цана 80 кап.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — ОПЭРА
НЯДЗЕЛЯ, 1-га чэрвеня „АИДА"

Тэатр саду „Прафінтэрн" — Мастацкі перасовачны тэатр „КРАСНЫЙ ФАКЕЛ" Нядзеля, 1 чэрвеня, для МЕНБУДУ ЧУДАК камэдыя ў 4-х дзеях.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ мастацкая кіно-аповесьць Вецер у твар

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — Мастацкі фільм у 7 частках СЭКТАНТЫ. Звыш праграмы кіно-часопіс Саўкіно № 25. Пачатак роўна а 7 г. )—( Каса ад 5 гадз.

КІНО Петэрбургскіяе — Амэрыканскі мастацкі фільм 1.000 КОНСКІХ СІЛ (Буры ў Каліфорніі) —) Звыш праграмы: КУЛЬТУРФІЛЬМ (— Вытворчасьць электрычн. лямпачак. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. увеч. | Каса ад 5 г.

—)КІНО(— САД (Савецкая. 71) — ПАТ І ПАТАШОН у новай камэдыі ПАЧАТАК КАР'ЕРЫ кам. у 7 частках. Звыш праграмы хроніка САЎКІНО № 24. Пачатак 1-га сэансу а 9 гадз. )—( Каса з 6 г.

КІНО Пралетарый — ТРУКАВЫ КІНО-РАМАН МІС МЭНД. 2 сэрыі—11 частак у адзін сэанс. У галоўнай ролі Ігар Ільінскі. Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. — Каса з 5 гадз.

1-ны дзіцячы кіно-тэатр Юны Піянэр — КУЛЬТУРФІЛЬМ ТУРКСІБ у 5-ці частк. Звыш праграмы хроніка „САЎКІНО". Пачатак 1 сэансу а 2 гадз. дня. Касаз 12 г.

КІНО СПАРТАК — НЯМЕЦКІ БАЯВІК ЖЫЦЬЦЁ за ЖЫЦЬЦЁ драма ў 10 частках. Пачатак 1 с.—6 г., 2 с.—8 г. 30 м., 3 с.—11 г. Каса—з 5 гадз.

УВАГА!!! Хто яшчэ ня бачыў? УВАГА!!!

ВЫСТАЎКА ДРУКУ

ПРЫ ГАБІНЭЦЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ КАМВУЗУ імя Ў. І. ЛЕНІНА ПРАЦЯГНУТА ДА 10 ЧЭРВЕНЯ

выстаўка рэарганізавана і папоўнена новымі экспанатамі

Наведваньне выстаўкі штодня ад 4 да 10 г. увечары як экскурсіям, так і індывідуальна — ЭКСКУРСІЯМ КАНСУЛЬТАЦЫЯ —

Усе на выстаўку друку!

Габінэт журналістыкі НУБ.

Завод „БЕЛАРУСЬ" (МЕНСК, СТАРАЖОЎСКАЯ, 44) купляе парожнія бутэлькі

Піўныя . . . . . 0,6 літра—10 кап.
Ланінскія (з-пад сітро) . 0,3 літра— 7 кап.
Нарзанкі . . . . . 0,4 літра— 5 кап.
Цёмныя вінныя. . . 0,38 літра— 5 кап.

У любой колькасьці начыньне можа здавацца як на завод, так і ва ўсе розьнічныя аддзяленьні заводу

Нівавая каапэрацыя, якая мае справу з заводам, таксама прымае начыньне па пазначаных цэнах.

За дастаўку каапэрацыяй завод плаціць па 1 кап. з бутэлькі.

Разьлік праз Дзяржбанк, кант. «53».

Дырэкцыя.

АСІНБУДАМ

ЭКСКУРСІІ будуць прымацца выключна па папярэднім узгадненьні з апошнім ЗА 10 ДЗЁН і толькі па ПАНЯДЗЕЛКАХ, СЕРАДАХ, і ПЯТНІЦАХ штотыдніёва.

МЕНАКРКАЛГАССАЮЗ ПЕРАЕХАЎ з памяшканьня (Савецкая, 60) у новае памяшканьне ПЛЯЦ ВОЛІ, 4 пры АКРЭА, УВАХОД СА ДВАРА

ЗАЎТРА, 2-га чэрвеня, у гор. МАСКВЕ пачынаецца 12 і 13 ТЫРАЖЫ ВЫЙГРЫШАЎ ПА 1-ай ПАЗЫЦЫІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Тыражы працягнуцца да 5-га чэрвеня 1930 г.

12 і 13 тыражы выйгрышаў праводзяцца ДАТЭРМІНОВА, на аснове пастановы НКФ СССР ад 17 мая 1930 г., з прычыны абмену гэтае пазыкі на пазыку «Пяцігодка за чатыры гады». У тыражы прымаюць удзел усе аблігацыі, апрача выйграўшых у ранейшых тыражох.

ПА АБОДВЫХ ТЫРАЖОХ БУДЗЕ РАЗЫГРАНА

46.600 ВЫЙГРЫШАЎ на суму 6.003.000 рубл.

Выплата выйгрышаў будзе праводзіцца ў першапачаткова ўстаноўленыя па гэтых тыражох тэрміны: па 12 тыражы, пачынаючы з 20 жніўня 1930 г., па 13 тыражы—з 20 лістапада 1930 г.

Нарнамфін БССР

Ад Беларускага Аддзяленьня Цэнтрапасрэдрабісу На аснове распараджэньня Цэнтрапасрэдрабісу пры НКП СССР ад 15 сакавіка г. г. за № 710-48 НАЙМАЛЬНІКІ надалей АПЛАЧВАЮЦЬ пасярэдніцкія апэрацыі па найме работнікаў мастацтва адначасова з патрабаваньнем на іх, а таму абвяшчаецца, што з 20-га мая СПЫНЕН ПРЫЁМ ЗАКАЗАЎ ад усіх устаноў і клюбаў на артыстычныя сілы БЯЗ АПЛАТЫ ПРОЦАНТАЎ за пасярэдніцкія апэрацыі пры падачы заявак

Беларускае Аддзяленьне Цэнтрапасрэдрабісу.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ

МОСКВА 55. 2-я ВЫШЕСЛАВЦЕВ ПЕР. №

Для здачы АБВЕСТКІ у газету „ЗЬВЯЗДА" звяжыцеся па тэл. 7-81

50 к. кошт публікацыі аб згубе дакумента

ОТКРЫТА ПОДПИСКА на 1930 год

на журнал, освещающий вопросы техники и экономики шелкодобывающей и шелкообрабатывающей промышленности СССР и научно-исследовательскую работу в области шелка

„СОВЕТСКИЙ ШЕЛК" (б. „СРЕДНЕ-АЗИАТСКИЙ ШЕЛК")

издаваемый акц. О-вом «ТУРКШЕЛК» и Ср. Аз. Институтом Шелководства.

Ответственный редактор И. А. Фатьянов. Отделы под редакцией Т. П. Арикиной. Проф. В. В. Линде, проф. З. Ф. Пояркова, профессор А. И. Приббе, В. И. Рязанова., доц. И. И. Слонимский, И. И. Ореевецкого.

ПОДПИСНАЯ ЦЕНА НА ГОД:

для учреждений—12 р., для работников шелкового дела—6 р., для прочих подписчиков—8 р. Допускается рассрочка в два срока; половина—при подписке, остальная сумма—не позднее июля. Осталось ограниченное количество номеров журнала за прошлый год:

№ 4-6—2 руб. 50 к.; № 7-9—3 руб.

Выпуски за 1929 г, высылаются только с наложенным платежом.

Адрес редакции: Ташкент, ул. Сталина-Правда, дом Акц. О-ва „Туркшелк"

Рабселькоры, низовые газеты не с... гут решить тех задач, которые ст... перед ними в подготовке к XV... партс'езду и 2-ой областной ко... ренции, НЕ ПЕРЕСТРОИВ В КО... ВСЮ СВОЮ РАБОТУ.

ПЕРЕСТРОИТЬ РАБО... ПОМОЖЕТ БРОШЮР...

С. ЕВГЕНОВ.

КАК ПЕРЕСТРОИТЬ... боту стенных газ... рабселькоров,

КАК БОРОТЬСЯ за... ственность замето...

Цена 30 к.

Высылает Западное Областное Отделение Госиздата — СМОЛЕНСК, Советская улица, д. №...

Украдзены КОНЬ 4 год масьці цёмна-гараной, на машонцы белая пляма, грыва курчавая, хвост доўгі. Просьба паведаміць па адрасе: г. Стары Быхаў, Магілеўск. акр., Лудчыцкі с.-с., в. Лудчыцы, Галавкову Сямёну Т.


Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Галоўлітбел № 337.